Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 ЧЭРВЕНЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 115 (27973) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Сціплы і цярплівы Васіль Быкаў

СТАР. 4



## На адной хвалі з Тамарай Вяцкай

СТАР. 5



## Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

# Нашы дзяўчаткі



Фота БЕЛТА.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Марыяна ШЧОТКІНА, міністр працы і сацыяльнай абароны Беларусі:**

*«Выбраны прыярытэт — сацыяльная падтрымка сям'і — не зменіцца, паколькі нашы дзеці — гэта будучыня краіны, і ўсё, што абяцана сем'ям, будзе выконвацца. Усе разумеюць, што якія б ні былі эканамічныя цяжкасці, але калі не будзе створана адпаведных умоў для павышэння нараджальнасці, то адны словы ні да чаго не прывядуць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.06.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15360,00 | ▼ |
| Еўра | 17464,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 287,32 | ▲ |
| Укр. грыўня | 722,82 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Інавацыі

## КАЦЁЛ ЯК РУХАВІК КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНАСЦІ

### Новае воданагравальнае абсталяванне атрымлівае энергію з адходаў птушкафабрык

**У Беларусі існуе прымаўка, што з мужыка пан такі, як з гною куля. А вось айчынныя кулібіны гэтую народную мудрасць крыху падкарэктавалі. Цяпер акцыянернае таварыства «Белкатламаш» стала першым беларускім прадпрыемствам, дзе наладзілі вытворчасць новага перспектыўнага віду прадукцыі: воданагравальных катлоў, якія спальваюць падсцілачна-памётную масу.**

Падобная ўтылізацыя адходаў птушкагадоўлі дазваляе вырашыць адразу дзве важныя для прамысловасці задачы: эканамічную і экалагічную. Кацёл не толькі выпрацоўвае цеплавую энергію, але і спальвае курыны памёт, які пры ненале́жных умовах захоўвання, перапрацоўкі і ўтылізацыі робіцца небяспечным.

Вядома, што сёння куранят-бройлераў гадуюць у асноўным на глыбокай падсцілцы. Перавага гэтай тэхналогіі складаецца ў тым, што з сутачнага ўзросту і да забою птушку ўтрымліваюць у адным памяшканні. Глыбокая падсцілка добра паглынае вільгаць, шкодныя газы, паляпшае санітарны стан памяшкання і служыць цеплаізаляцыяй. Аднак гэты спосаб мае адзін сур'ёзны недахоп, бо на адно кураня трэба каля 2,5-3 кілаграмаў пілавіння.

СТАР. 3

■ Надвор'е

## ПРЫЙДУЦЬ НАВАЛЬНІЦЫ І... ПАЦЯПЛЕЕ

**У гэтыя выхадныя на тэрыторыі Беларусі прагназуюцца кароткачасовыя навальнічныя дажджы, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды.**

Сёння тэрыторыя краіны трапіць пад уплыў атмасферных франтоў. Чакаецца пераменная воблачнасць, а ўдзень па ўсходзе Магілёўскай і Гомельскай абласцей пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Максімальная тэмпература паветра складзе плюс 16-22 градусы, толькі па паўднёвым усходзе Беларусі чакаецца ўжо да 25 цяпла.

У суботу і нядзелю надвор'е ў Беларусі будзе вызначаць малаактыўны атмасферны фронт. Месцамі пройдуць кароткачасовыя навальнічныя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 7-14 градусаў. Удзень чакаецца плюс 16-23 градусы, а па паўднёвым усходзе да плюс 25.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у першыя дні наступнага тыдня тэрыторыя краіны трапіць у зону паніжанага атмасфернага ціску. Таму месцамі чакаюцца кароткачасовыя дажджы, прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 6-12 цяпла, а ўдзень прагназуецца плюс 16-23 градусы. Аднак падчас дажджоў месцамі тэмпература паветра можа знізіцца на некалькі градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

ЗВЯЗДА
*Да чытача з любоўю!*

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

5 разоў на тыдзень!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2015 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

# ШУКАЦЬ НЕ ПРЫЧЫНЫ, А ШЛЯХІ ПЕРААДОЛЕННЯ

## Прэзідэнт патрабуе больш эфектыўных захадаў па вырашэнні праблем у дрэваапрацоўчай галіне

**Пра гэта Аляксандр Лукашэнка заявіў на нарадзе аб актуальных пытаннях развіцця арганізацый дрэваапрацоўкі, праблемах і шляхах вырашэння, паведамляе БЕЛТА.**

«Мы ўжо не першы раз абмяркоўваем праблемы дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў і былі таксама вымушаны прымаць непапулярныя рашэнні па асобных прадпрыемствах, — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі. — Але, як мне дакладваюць, сітуацыя там не радасная. Так званыя часовыя цяжкасці зацягваюцца на даволі доўгі перыяд».

«Зразумела, што на рынках спад, канкурэнты працуюць хутчэй за нас, рэсурсы ў Расіі таннейшыя і іншае, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Але гэта проста размовы і адгаворкі, якія сёння не прымаюцца. Тыя, хто думае такімі катэгорыямі, проста не адчуваюць сітуацыю вакол. У Еўропе рэсурсы яшчэ даражэйшыя, а цэны і якасць, тым не менш, больш прымальныя. Таму давайце не будзем займацца пошукам вонкавых прычын, а прааналізуем рэальную сітуацыю і шляхі вырашэння праблем. Нават калі гэта так, як вы гаворыце, гэта таксама не мае нічога агульнага з тымі задачамі, якія трэба вырашаць. Мы жывём у тых умовах, у якіх жывём. І вы знаходзіцеся на адпаведных пасадах для таго, каб вырашаць праблемы, якія ёсць у тых умовах, у якіх мы жывём».

Прэзідэнт сказаў, што сёлета ўрад настойваў на прынцыпі ўказа аб рэструктурызацыі даўгоў шэрагу прадпрыемстваў, і ўказ быў падпісаны. Праз месяц з'явіўся новы праект указа. «Пры гэтым да цяперашняга часу не зразумела, калі завершацца гэтыя часовыя праблемы, як будуць развівацца прадпрыемствы і ці змогуць прапановы ўрада аздаравіць дрэваапрацоўчую галіну», — адзначыў Прэзідэнт. Ён таксама падкрэсліў, што нікому не патрэбны пустыя абяцанні. «Нельга дапусціць самападманy і перакладвання рашэнняў на будучы, нейкі лепшы час», — запатрабаваў кіраўнік дзяржавы.

Развіццё гэтай галіны кантралюе і Камітэт дзяржаўнага кантролю. «Старшыня КДК згадзіўся з усімі прапановамі ўрада, і я хачу яшчэ раз пачуць вашу прынцыповую ацэнку сітуацыі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Ён нагадаў, што ў мадэрнізацыю ўкладзена больш за мільярд долараў. «Што далей? Будзем завяршаць мадэрнізацыю і проста чакаць, калі рынкі самі ўзнімуцца, або прымаць дзейсныя меры па развіцці галіны?» — пацікавіўся Прэзідэнт. Ён таксама пацікавіўся альтэрнатыўнымі пазіцыямі па гэтых пытаннях.

Кіраўнік дзяржавы даў шэраг даручэнняў, накіраваных на комплекснае вырашэнне ўсіх праблем у дрэваапрацоўчай галіне.

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

23 чэрвеня 2015 года ў 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца пасяджэнне дзявятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

■ Тры пытанні да ўлады

# ВЯРТАННЕ АГІНСКАГА

**25 верасня спаўняецца 250 гадоў з дня нараджэння кампазітара, дыпламата, палітычнага дзеяча Міхала Клеафаса Агінскага, чый лёс непарыўна звязаны са Смаргоншчынай. Тры пытанні «Звязды» — да намесніка старшыні Смаргонскага райвыканкама Генадзя БЫЧКО.**

***— Нядаўна адноўлены сядзібны дом Агінскіх у Залессі. Што робіцца па выкарыстанні яго культурнага і турыстычнага патэнцыялу?***

— Рашэннем Смаргонскага раённага выканаўчага камітэта мы стварылі дзяржаўную гісторыка-культурную ўстанову «Музей-сядзіба М.К. Агінскага», а пад навуковым кіраўніцтвам дырэктара Дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі Зінаіды Кучар распрацавалі канцэпцыю музеефікацыі сядзібы.

Але ўжо і цяпер, не маючы пакуль пастаяннай экспазіцыі, у Залессі актыўна працуюць па папулярызацыі сядзібы Агінскіх — ладзяць экскурсіі, розныя цікавыя імпрэзы. Сёлета сядзібу наведалі ўжо каля 6 тысяч турыстаў, якія азнаёміліся з памяшканнямі палаца, гістарычным паркам, выставамі. У прыватнасці, шматлікіх наведвальнікаў зацікавіла выстава «Паланэзы на вяртанне» (дакументы і гравюры з гісторыі роду Агінскіх), якую прадставіў Дзяржаўны музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі. А ў тэатральна-музычнай зале сядзібы, як і пры Агінскіх, праходзяць канцэрты і творчыя сустрэчы. У гэтым юбілейным для нашага знакамітага земляка годзе жыхары і госці Залесся змаглі азнаёміцца з музычнай спадчынай сям'і Агінскіх, іншымі старадаўнімі творамі музыкі ў выкананні артыстаў Мінскай і Гродзенскай філармоній, музычнага каледжа імя Глінкі, народных калектываў Смаргонскай дзіцячай школы мастацтваў імя М.К. Агінскага. У сядзібе ўпершыню прайшлі дабрачынны баль, акцыя «Ноч музеяў», а таксама конкурс-пленэр навучэнцаў школ мастацтваў. Музейшчыкі з Залесся абмеркавалі з беларускімі тураператарамі тэму ўключэння сядзібы ў турыстычныя маршруты.

***— Ці плануюцца праекты па аднаўленні іншых аб'ектаў гістарычнай спадчыны ў Залессі?***

— Для аднаўлення сядзібных аб'ектаў (млын, альтанка Амеліі, гаспадарчая пабудова) неабходна карэкціроўка праектна-каштарыснай дакументацыі, якая ў свой час была зроблена, аднак пакуль не рэалізавана. Рэстаўрацыі патрабуе і гістарычны парк з воднымі аб'ектамі, які займае плошчу ў 25 гектараў. На жаль, у парку не захавалася рамантычная кітайская альтанка, але мы яе збіраемся аднавіць па інвентарных апісаннях. Гэтае пытанне цяпер у падрыхтоўчай стадыі. Спадзяёмся, што частку работ па аднаўленні гістарычных аб'ектаў у Залессі здолеем ажыццявіць у рамках трансгранічных праектаў, як гэта ўдалося зрабіць з канцэртнай залай сядзібнага палаца дзякуючы супрацоўніцтву з літоўскімі партнёрамі.

***— Якія імпрэзы рыхтуюць смаргонцы да юбілею Міхала Клеафаса Агінскага?***

— Урачыстасці адбудуцца ў Залессі 25-26 верасня. Для мясцовых жыхароў і гасцей, у прыватнасці, наладзім свята «Вяртанне Паўночных Афін» з удзелам Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра пад кіраваннем Міхаіла Фінберга, адкрыем пастаянную экспазіцыю музея-сядзібы М.К. Агінскага, напярэдні правядзём міжнародную навукова-практычную канферэнцыю, прысвечаную яго спадчыне ў культуры трох народаў. Дарэчы, у жніўні, адбудзецца ўжо традыцыйны фестываль «Залессе запрашае сяброў». А ў лістападзе сядзіба сустрэне ўдзельнікаў XI Міжнароднага конкурсу камерных ансамбляў імя М.К. Агінскага. Бібліятэкі раёна праводзяць краязнаўчыя і літаратурна-музычныя імпрэзы. І, зразумела, распрацоўваецца і выпускаецца сувенірная прадукцыя.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

*prakopchik@zviazda.by*

# ІМІДЖМЕЙКЕРЫ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАЛІТЫКІ

## У Мінску на форуме абмеркавалі ролю ідэалогіі ў жыцці грамадства

**Ідэолаг — спецыяліст, які павінен не толькі валодаць арганізатарскімі навыкамі, але і разбірацца ў піяр-тэхналогіях, быць добрым аратарам і ўмець знаходзіць падыход да кожнага чалавека. Пра гэта, а таксама пра патрабаванні да ідэалогіі ў нашай краіне ішла гутарка на рэспубліканскім форуме-практыкуме «Ідэалагічная работа ў кантэксце ключавых палажэнняў Паслання кіраўніка дзяржавы беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь».**




### МІР І ПАРАДАК — ТАКСАМА ВЫНІК ІДЭАЛОГІІ

Як паведаміў **Ігар БУЗОЎСКІ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта**, сёння ў краіне ў ідэалагічнай вертыкалі працуе амаль 10 тысяч чалавек.

— Гэтыя людзі працуюць на прадпрыемствах, у арганізацыях, грамадскіх структурах, — патлумачыў прадстаўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — За мяжой іх называюць па-рознаму: іміджмейкерамі, піяр-менеджарамі.

Ён адзначыў, што ацэнка працы ідэалагічнай вертыкалі характарызуецца паняццямі «стабільнасць», «мір», «парадак».

— Стабільнасць, каштоўнасці, якія існуюць у грамадстве, — гэта здабытак і заслуга ідэалагічнай вертыкалі, — заявіў Ігар Бузоўскі.

Закранаючы тэму прэзідэнцкіх выбараў, Ігар Бузоўскі адзначыў:

— Людзі чакаюць адказу на ключавое пытанне: што будзе далей? Што будзе з курсам рубля і цэнамі, што будзе з працоўнымі месцамі: як на дзяржпрадпрыемствах, так і ў прыватным сектары? Што новага прапануе ўлада ў адказ на выклікі, звязаныя з крызіснымі з'явамі ў нашай эканоміцы і ў эканоміцы нашых суседзяў?

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта падкрэсліў, што эканоміка і ідэалогія цесна звязаны.

— Улада павінна мець і прапаноўваць рашэнні, ствараць такія ўмовы, каб каля таго прадпрыемства, што зачынілася, узнікла другое, больш перспектыўнае, з новымі працоўнымі месцамі і больш высокай заработнай платай. Ідэалогія не можа быць адарванай ад эканамічных і вытворчых паказчыкаў, — заявіў Ігар Бузоўскі.

### ШЫРОКАФАРМАТНЫ СПЕЦЫЯЛІСТ

— Ідэолаг — шырокафарматны спецыяліст, які павінен валодаць ведамі ў галіне менеджменту, PR-тэхналогій, аратарскага мастацтва, — упэўнены Ігар Бузоўскі. — Патрабаванні, якія сёння прад'яўляюцца да ідэалагічнай галіны, дастаткова высокія, паколькі геапалітыка дыктуе канкурэнтныя ўмовы з іншымі краінамі. Прафесійная якасць — крытэрый, якім сёння вызначаецца дэфіцыт кадраў.

Падчас выступлення на пленарным пасяджэнні Ігар Бузоўскі звярнуў асаблівую ўвагу на неабходнасць арганізацыі сістэмнай працы з кадравым рэзервам, а таксама на важнасць працы з моладдзю.

— Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на маладых спецыялістаў. Важная такая форма працы, як настаўніцтва: яна вельмі эфектыўная, калі да яе падыходзіць не фармальна. Не варта забываць пра работу з таленавітай і адоранай моладдзю, якая з'яўляецца прыкладам для іншых.

Гаворачы пра ролю СМІ ў працэсе ідэалагічнага выхавання, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта падкрэсліў, што традыцыйныя масмедыя «павінны выйсці за мяжу звычайнага інфармавання».

— Стужку навін прадастаўляе сёння вялікая колькасць рэсурсаў, — аргументаваў ён. — Аналітычнасць — найбольш актуальная задача, якая стаіць перад традыцыйнымі сродкамі масавай інфармацыі.

Ігар Бузоўскі таксама звярнуў увагу на ролю сацыяльных сетак, а таксама на іх уплыў на насельніцтва.

— Калі мы хочам быць пачутымі, трэба прыходзіць на тыя пляцоўкі, дзе збіраюцца людзі, — заявіў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. — І даваць інфармацыю нам трэба ў адпаведнасці з асаблівасцямі інтэрнэту — хутка, лаканічна і аргументавана. У новых умовах традыцыйным СМІ трэба праяўляць больш творчай ініцыятывы і ў стварэнні арыгінальных інфармацыйных ніш. Калі інтэрнэт мае перавагу ў аператыўнасці, трэба гэтым карыстацца.

### ДАВЕР — ГАЛОЎНЫ КРЫТЭРЫЙ

У сваю чаргу **старшыня Мінгарвыканкама Андрэй ШОРАЦ** падкрэсліў: без ідэалагічнага суправаджэння немагчымая ніводная сфера дзейнасці.

— Ідэолагам неабходна наладзіць эфектыўную зваротную сувязь з насельніцтвам. Мы павінны бачыць, што хвалюе людзей, якія праблемы неабходна вырашаць. Ад узаемаразумення і ўзаемадзеяння ў гэтай сферы залежыць многае, — заявіў Андрэй Шорац.

Старшыня Мінгарвыканкама выказаў упэўненасць, што ідзі, якія будуць агучаны на семінарах, дапамогуць выйсці на новы ўзровень у ідэалагічнай працы з грамадзянамі.

**Ігар КАРПЕНКА, намеснік старшыні Мінгарвыканкама**, акцэнтаваў увагу на выніках сацыялагічных даследаванняў Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі: 53% насельніцтва Мінска давяраюць уладзе, больш за 60% мінчан станоўча ацэньваюць яе дзейнасць.

— Сам факт таго, што мінчане звяртаюцца ў гарвыканкам для рашэння сваіх надзённых праблем, сведчыць пра гэта, — упэўнены Ігар Карпенка. — Людзі разумеюць, што органы ўлады сёння ў стане дапамагчы ў вырашэнні розных пытанняў.

* * *

**Падчас форуму адбыліся тэматычныя секцыі, на якіх абмеркаванне ролі ідэалогіі і ідэолагаў было працягнута.**

**Уладзімір МАТУСЕВІЧ, намеснік міністра інфармацыі,** мадэратар секцыі «Сучасныя камунікацыі ў ідэалагічнай працы»:

— Сучасныя камунікацыі адыгрываюць вялікую ролю ў ідэалагічнай рабоце. Сёння ідэолагі, СМІ павінны актыўна выкарыстоўваць патэнцыял інтэрнэту, паколькі менавіта глабальная камп'ютарная сетка з'яўляецца асноўнай крыніцай інфармацыі для большай часткі насельніцтва Беларусі. Уменне працаваць у сацыяльных сетках — гэта абавязак і дзяржорганаў, і ідэалагічнай вертыкалі, і СМІ, калі яны хочуць быць актуальнымі, канкурэнтнымі, эфектыўнымі.

СМІ актыўна выкарыстоўваюць новыя формы работы. Друкаваныя сродкі масавай інфармацыі маюць электронныя версіі, развіваецца інтэрнэт-тэлебачанне. Ва ўсіх рэгіянальных газет ёсць сайты. Вядома, яны маюць розны кантэнт і структуру і, безумоўна, павінны ўдасканальвацца.

**Аляксей ДЗЕРБІН, дырэктар Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі,** мадэратар секцыі «Ідэалагічнае забеспячэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны»:

— Ідэалагічны работнік павінен быць сувязным звяном у пошуку рашэнняў існуючых праблем. Важна не дапусціць узнікнення сацыяльнай напружанасці, што правакуецца няпростымі працэсамі скарачэння штатаў і рэструктурызацыі прадпрыемстваў, аказваць людзям неабходную маральную і практычную падтрымку.

У секцыі «Ідэалагічнае забеспячэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны» ўсе ўдзельнікі дыскусіі пагадзіліся з думкай, што важная задача ідэалагічнага забеспячэння — растлумачваць насельніцтву, што вынікі работы прадпрыемстваў і ўсёй эканомікі, дабрабыт кожнай сям'і залежаць ад захавання працоўнай дысцыпліны, добрасумленнага выканання абавязкаў і ініцыятыўнасці. Крызісы прыходзяць і адыходзяць, а кадравы і працоўны патэнцыял — гэта галоўнае, што вызначае нашу сучаснасць і будучыню.

**Марат ЖЫЛІНСКІ, рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Беларусі,** мадэратар секцыі «Дзяржаўная кадравая палітыка і механізм яе рэалізацыі ў сістэме падрыхтоўкі ідэалагічных работнікаў»:

— Падрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі ідэалагічных кадраў — гэта складаны і шматгранны працэс, які патрабуе комплекснага падыходу. Вынікам яго павінны стаць веды і кампетэнтнасць ідэолагаў, разуменне імі жыцця і непадробны інтарэс да людзей, іх запатрабаванняў і патрэб.

Галоўнае ў ідэалагічнай дзейнасці — гэта работа з канкрэтным чалавекам. Дайсці да душы і свядомасці кожнага — гэта майстэрства і вялікая праца. Таму ідэалагічны работнік павінны мець самую высокую кваліфікацыю і адпаведную спецыяльнасць.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

*yushkevich@zviazda.by*

■ Новы фармат



# БОЛЬШ ЧЫМ КІЁСК:

## «БЕЛСАЮЗДРУК» ПРАПАНУЕ КАВУ, МАРОЗІВА, ПАДПІСКУ І БУККРОСІНГ



— Кава ў нас выдатная! — кажа прадавец Ларыса ПАЛІШЧУК.

**«Гатуйце традыцыйна і па-новаму, «па-венску», «па-турэцку» — як жадаецца! Я выбіраю каву «па-паштоваму», каторай твае вусны дакранаюцца». Гэтыя радкі прыйшлі ў галаву аднаму з наведвальнікаў новага павільёна РУП «Белсаюздрук», што адкрыўся ўчора ля станцыі метро «Маскоўская». У павільёне працуе кандыцыянер, ёсць цёплая падлога і цеплавая заслона ля дзвярэй (на выпадак халадоў), можна пагартаць і набыць перыёдыку, канцылярскія тавары, сувеніры, а таксама кандытарскую прадукцыю, халодныя напоі, марозіва і нават каву. Таму не дзіўна, што атмасфера тут у пэўным сэнсе натхняе на творчасць.**



Каму з пакупнікоў пашанцуе? За тэрміналам гульняў і латарэі прадавец Людміла СКОК.




Так выглядае кіёск звонку.

Першы такі павільён у Мінску з'явіўся ў 2010 годзе. Ідэю запазычылі ў нашых еўрапейскіх суседзяў — Літвы і Латвіі, дзе падобны фармат пунктаў продажу перыёдыкі распаўсюджаны даволі шырока.

— Павільёны мы ставім там, дзе бачым, што кіёскі вычарпалі свае тэхнічныя магчымасці, — распавёў **начальнік сектара па паслугах Андрэй ГАРКАВЫ**. — Цяпер прыярытэт надаём формам з магчымасцю самаабслугоўвання. Гэта не толькі зручна для кліентаў, але і дазваляе павялічыць тавараварот.

Павільён на «Маскоўскай» плошчай у 25 квадратных метраў аформлены ў новым дызайне і стрыманых шэрых колерах. Камфорт надаюць сучасныя матэрыялы, прыемныя адценні, дзённае святло з вітрын і яркае электрычнае асвятленне ў цёмны час сутак, водар кавы і свежых газет, часопісаў, кніг. Усё можна памацаць, пагартаць, разгледзець бліжэй, а заадно паласавацца сэндвічамі, эклерамі і іншымі слодычамі. Дарэчы, для тых, хто набывае перыядычнае выданне, да канца чэрвеня дзейнічае 10-працэнтная зніжка на каву, якую гатуюць тут жа ў кава-машыне.

Зрэшты, кавай у «Белсаюздруку» ўжо амаль нікога не здзівіш. Затое нязвыклая пакуль ідэя ўсталявання тут кошыкаў для буккросінгу (папулярны ва ўсім свеце рух па бясплатным абмене кнігамі) — з часам у новым павільёне такі таксама з'явіцца.

Апроч традыцыйнага набору тавараў, які можна знайсці ў кіёсках, павільён рэалізуе квіткі на канцэртна-відовішчныя мерапрыемствы, латарэйныя білеты, інтэрнэт- і тэлекарты. Плануецца абсталяваць новы пункт з відэаназіраннем і экранам, дзе будуць паказваць музычныя кліпы. А яшчэ ў павільёне «Белсаюздрук» можна аформіць падпіску на любімыя перыядычныя выданні і тут жа іх атрымліваць. Дарэчы, такім чынам падпіска будзе каштаваць на 20% менш, бо з кліента не здымаецца плата за дастаўку. Плаціць за тавары і паслугі тут можна як гатоўкай, так і пластыкавай карткай.

— Павільён таксама будзе ажыццяўляць выдачу заказаў з нашай інтэрнэт-крамы. Яна працуе ў асноўным на рэгіёны, бо не паўсюль ёсць такі шырокі асартымент перыёдыкі, кніг і канцылярскіх тавараў, як у Мінску. Пакупнік робіць заказ і сам выбірае павільён, дзе яму будзе зручна яго забраць, — патлумачыў Андрэй Гаркавы.

Ці папулярны такі фармат продажу перыёдыкі ў мінчан? Пра гэта можна меркаваць нават па тым, што пакуль павільён рыхтавалі да адкрыцця, выстаўляючы тавары і цэны, у яго пастаянна ўваходзілі людзі. Як паказвае практыка, падобны профіль работы дазваляе павялічыць тавараварот удвая.

Усяго ў сталіцы працуюць 24 павільёны розных фарматаў, дзе рэалізуецца да 700 найменняў газет і часопісаў штомесяц. А 160 крам аўтаматызаваныя, г.зн. улік тавару вядзецца ў анлайн-рэжыме, прадугледжана магчымасць папаўняць прылаўкі па неабходнасці. У многіх гандлёвых аб'ектах ёсць адведзеныя пад кавярні зоны, Wi-Fi, у адным усталяваны тэрмінал для плацяжоў, а крама «Белсаюздрук», што знаходзіцца на чыгуначным вакзале, працуе кругласутачна. Новы ж павільён па адрасе праспект Незалежнасці, 98 для зручнасці кліентаў будзе працаваць з 7 раніцы да 20 вечара без перапынку на абед.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.** *seradzyuk@zviazda.by*
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА**

■

# КАЦЁЛ ЯК РУХАВІК КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНАСЦІ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

У выніку на кожнай фабрыцы, якая выкарыстоўвае тэхналогію падлогавай гадоўлі, кожны дзень назапашваюцца дзясяткі тон выкарыстанай падсцілачна-паметнай масы. Птушкафабрыка на 400 тысяч нясушак атрымлівае за год каля 30 тысяч тон памёту. Пры яго гніенні вылучаецца каля 700 тон біягазу, у тым ліку 450 тон метану, 208 тон вуглякіслага газу, 35 тон вадароду, серавадароду і аміяку. Шкода экасістэме ад выкідаў ацэньваецца ў мільёны долараў.

Таму для птушкафабрык Беларусі і іншых краін свету ўтылізацыя адходаў птушкагадоўлі з'яўляецца даволі складанай задачай. Такую памётную масу (у натуральным або грануляваным выглядзе) можна выкарыстоўваць у якасці ўгнаенняў, але ўносіць яе ў глебу трэба ў невялікай колькасці, бо ў адваротным выпадку зямля на доўгі час выводзіцца з абароту. Калі ў непасрэднай блізкасці адна ад адной знаходзіцца некалькі буйных птушкафабрык, то ўтылізацыя адходаў з'яўляецца ўжо сур'ёзнай экалагічнай праблемай.

Аптымальнае выйсце з сітуацыі — спальванне памёту ў катлах, якія працуюць на цвёрдым паліве. Задача гэтая не з лёгкіх. Падсцілачная маса змяшчае злучэнні серы і фосфару, якія разбураюць трубавую сістэму агрэгатаў і за лічаныя месяцы выводзяць яе са строю. Адным з прадпрыемстваў не толькі ў Беларусі, але і на ўсёй постсавецкай прасторы, якое ўзялося за вырашэнне гэтай праблемы, з'яўляецца «Белкатламаш».

Распрацаваная ім устаноўка можа выкарыстоўваць падсцілачны памёт вільготнасцю да 60%. Цеплавая энергія, атрыманая пры спальванні, ідзе на абагрыванне і тэхналагічныя патрэбы птушкафабрыкі. Памёт не патрабуе папярэдняй сушкі або гранулявання, што значна спрашчае ўвесь працэс. Ужо сёння спецыялісты падлічылі, што выкарыстанне такога кацельнага абсталявання дасць магчымасць айчынным бройлерным птушкафабрыкам атрымаць шэраг канкурэнтных пераваг. У першую чаргу гэта дазволіць значна скараціць выдаткі на закупку газу, якія складаюць сотні тысяч долараў штогод (для птушкафабрык, якія выкарыстоўваюць газавыя катлы), знізіць капітальныя выдаткі на будаўніцтва сховішчаў памёту, а таксама істотна паменшыць экалагічную нагрузку на навакольнае асяроддзе шляхам утылізацыі таксічнага прадукту без неабходнасці яго працяглага захоўвання. Распрацоўшчыкі новага абсталявання паведамляюць, што выпрабаванне катла прайшло паспяхова, таму ў самы бліжэйшы час яно будзе пастаўляцца на птушкафабрыкі Беларусі, Расіі і іншых зацікаўленых краін рэгіёна.



Невялікія воданагравальныя катлы ўсталёўваюць непасрэдна на тэрыторыі птушкафабрыкі.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# МЕДАЛЬНЫ ДОЖДЖ НЕ КАНЧАЕЦЦА

**Васіль Кірыенка выйграў «золата» Еўрапейскіх гульняў у веласпорце ў гонцы з асобным стартам на дыстанцыі 51,6 км. Наш спартсмен пераадолеў дыстанцыю за 59 хвілін 36,03 сек. У падобнай гонцы жанчын нашу краіну прадставілі Алена Амялюсік і Таццяна Шаракова. На жаль, дзяўчаты не патрапілі на п'едэстал гонару, заняўшы 8-е і 11-е месца адпаведна.**

Алімпійскі чэмпіён Сяргей Мартынаў заваяваў бронзавую ўзнагароду ў стральбе з малакалібернай вінтоўкі на 50 м. Беларускі спартсмен выйшаў у фінал з лепшым вынікам, але ў вырашальнай частцы спаборніцтваў набраў 186,3 бала, што дазволіла заняць толькі трэцяе месца. Уладальнікам «золата» стаў Хенры Юнгхаенель (Германія), «серабро» ў актыве італьянца Марка дэ Нікола.

Сяргей Мартынаў застаўся незадаволены такім вынікам, адзначыўшы, што разлічваў заняць месца вышэй.

— Нават на першым этапе спаборніцтваў усё можна было зрабіць лепш. У ходзе фінальнай серыі ў сёмай спробе выбіў толькі 9,7 ачка, гэта знізіла шанцы ў барацьбе з італьянцам і немцам. Цяпер буду рыхтавацца да чэмпіянату Еўропы ў Марыборы, — сказаў беларускі спартсмен.

Сярэбраную ўзнагароду ў камандным турніры заваявала жаночая зборная Беларусі па стральбе з лука. У фінальным паядынку беларускія спартсменкі Ганна Марусава, Кацярына Цімафеева і Алена Толкач саступілі камандзе Італіі з лікам 3:5.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

## ШУКАЛІ РЫБУ І ЗГУБІЛІСЯ

**У Лідскім раёне выратавальнікі шукалі двух рыбакоў, якія згубіліся.**

У раёне вёскі Сцеркава Лідскага раёна мужчыны, якія рыбачылі на затопленых торфараспрацоўках, заблудзіліся ў цемры і не змаглі дабрацца да берага. Прычаліць у іх не атрымлівалася з-за выступаючых каранёў дрэў. Прыбыўшыя падраздзяленні МНС абследавалі прыбярэжную акваторыю і берагавую лінію. Пры дапамозе гукавой і светлавой сігналізацыі рыбакі былі знойдзены. Аматары адпачыць з вудай патлумачылі, што з вечара вырашылі абследаваць вадаём, а потым пераначаваць у машыне, каб з ранку выправіцца рыбачыць з лодкі. Але давесці задуманае да канца ў іх не атрымалася.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *sr@zviazda.by*

## АЙФОНЫ Ў... КАНІСТРЫ

**Незвычайны тайнік быў выяўлены ў рэспубліканскім пункце мытнага афармлення «Брузгі-2» у аўтамабілі Audi-100, на якім па «зялёным» калідоры грамадзянін нашай краіны вяртаўся ў Беларусь.**

Мытны кантроль праводзіўся з прымяненнем інспекцыйна-аглядначага комплексу, які не пакінуў незаўважаным схаваны тавар. У каністры з-пад маторнага масла знаходзілася 5 мабільных тэлефонаў маркі iPhone 6 агульным коштам амаль 80 мільёнаў беларускіх рублёў, паведамляе прэс-служба Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі.

Увогуле за 5 месяцаў сёлетняга года ў Гродзенскай рэгіянальнай мытні з дапамогай інспекцыйна-аглядначага комплексу выяўлена 65 фактаў хавання тавараў ад мытнага кантролю на агульную суму больш за 11 мільярдаў рублёў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

■ Светлы ўспамін

# У МАІМ ЖЫЦЦІ БЫЎ БЫКАЎ...

## Анатоль СУЛЬЯНАЎ — аб сваім сяброўстве з пісьменнікам

**«Чалавеку мужнага сэрца і добрай душы ў знак вечнага сяброўства», «Сардэчна ў знак памяці аб майскім пленуме Саюза пісьменнікаў БССР», «Міламу чалавеку і грознаму генералу, а таксама выдатнаму калегу-празаіку, з пяшчотнай любоўю»... Адну за адной кнігі Васіля Быкава здымае з паліц пісьменнік Анатоль Сульянаў. Гэта яму радкі, напоўненыя шчырасцю і цеплынёй, адрасаваў беларускі класік. З Васілём Быкавым яны сябравалі 25 гадоў. Сябравалі сумленна, шчыра, да апошняга дня. Сёння, у дзень нараджэння і напярэдадні гадавіны смерці класіка, мы пагутарылі з Анатолем Сульянавым і даведаліся, што, акрамя творчасці, аб'ядноўвала двух пісьменнікаў.**



Таісія СУЛЬЯНАВА, Васіль БЫКАЎ, Анатоль СУЛЬЯНАЎ і Алесь АДАМОВІЧ *(злева направа)*.

***— Анатоль Канстанцінавіч, дзе вы пазнаёміліся з Васілём Быкавым?***

— Першае маё знаёмства з Васілём Быкавым было завочным. У той час я працаваў у Маскве, у Міністэрстве абароны. На адной з нарад, якую праводзіў намеснік міністра абароны, гаворачы пра культурнае выхаванне ваеннаслужачых, ён назваў некалькі прозвішчаў: Сіманаў, Бакланаў, Быкаў. З агаворкай, што апошні піша пра армію на ўзроўні аддзялення, узвода, роты, а мы, маўляў, ваявалі дывізіямі. Я гэта запомніў. Калі атрымаў прызначэнне ў Мінск, у ЦК КПСС мне сказалі, што ў Беларусі жыве Васіль Быкаў — выдатны пісьменнік, празаік, франтавік. Далі даручэнне прапанаваць Быкаву напісаць кнігу аб сучаснай арміі. І калі мы ўжо з ім зблізіліся, я, як вельмі спраўны афіцэр, так і зрабіў. «Па заданні я літаратуру не пішу. Пішу толькі па загадзе сэрца і перажытага асабістага жыцця», — адказаў ён мне.

На чарговым з'ездзе пісьменнікаў (я яшчэ быў журналістам) выпадала пабачыць знакамітых творцаў на ўласныя вочы: Шолахава, Сіманава, Бакланава, Быкава... Вакол кожнага вялікага заўсёды ж людзі стаяць. Я падыходзіў, слухаў, што яны гавораць. І так за 3-4 дні з'езда я завочна пазнаёміўся са знакамітымі пісьменнікамі. На першым з'ездзе да Быкава было не падысці: каля яго стаяў натоўп. Але ў мяне быў добры слых, і я чуў, пра што ён гаворыць. І ў той момант думаў: «Які я шчаслівы чалавек, што слухаю жывога Быкава!» На другім з'ездзе я падышоў вельмі блізка. Да таго часу Быкава я прачытаў амаль усяго. І калі яго ўбачыў, то зразумеў: адзін да аднаго — як ён піша, расказвае і як паводзіць сябе з навакольнымі. Для мяне гэта былі знаходкі, адкрыцці.

***— А якой запомнілася першая асабістая сустрэча з пісьменнікам?***

— Пасля з'езда я ўжо пачаў марыць пра асабістую сустрэчу. І думаю: «Першая паездка з інспекцыяй у Беларусь — я шукаю Быкава». Але сустрэча ў той час не адбылася. А толькі тады, калі мяне накіравалі па службе ў Мінск (гэта быў 1976 год). Як толькі я прыняў сваю новую пасаду, паляцеў у Гродна: ведаў, што ён жыве там. Пайшоў у райкам партыі, даведаўся адрас. Мне адчыніла жонка, запрасіла ў пакой, наліла гарбаты і прамовіла: «Ён тут ужо больш не жыве. Ён мяне пакінуў». Увесь вечар мы прасядзелі там з ад'ютантам, і Надзея Андрэеўна нам расказвала пра Васіля Быкава. Трэба аддаць належнае: яна яго не чарніла. Жанчына расказвала пра пісьменніка Васіля Быкава, нічога не гаворачы аб асабістым. І толькі калі мы сыходзілі, яна расплакалася. Вядома, на мяне гэта падзейнічала. Па першым часе я думаў, як такое магло адбыцца, і прыйшоў да высновы, што толькі моцнае каханне змагла зламаць гэтую сям'ю.

Васіль Быкаў ужо жыў у Мінску. І мне пашанцавала. Мяне пазнаёміў з Мікалаем Матукоўскім, які быў карэспандэнтам «Известий» па Беларусі. Ад яго і даведаўся, дзе Быкаў. Ён жыў на прыватнай кватэры. І Матукоўскі папрасіў мяне пры звароце ў ЦК нагадаць, што гэта нядобра і пісьменніку патрэбна кватэра. Праз некаторы час патэлефанаваў Матукоўскі і кажа: «Выдзяляйце салдат. Быкаў атрымаў кватэру. Заўтра будзем усяляцца». Я ўзяў з сабой групу салдат: трэба было перанесці мэблю з крамы на 9-ы паверх. Там Матукоўскі нас і пазнаёміў.

***— Калі зразумелі, што маеце патрэбу адзін у адным, што вы ўжо — сябры?***

— Мы не адразу назвалі адзін аднаго сябрам. Зрастанне нашых душ доўжылася года паўтара-два. Ён мяне першым назваў сябрам. Я не мог зрабіць гэта сам — асцерагаўся, як ён паставіцца. Быкаў ужо для мяне быў вялікі. Калі чалавек пераступае праз сціпласць, заканчваецца сяброўства. Я гэта разумеў. Першыя месяцы ў Беларусі я быў вельмі заняты, не меў ніводнага выхаднога дня. А калі ўжо пазнаёміўся з войскамі, здараецца, сяджу ў кабінеце, як тэлефануе Быкаў і кажа: «Мне без вас няўтульна. Калі ў мяне будзеце?» Я кідаў усе свае справы і ехаў на Танкавую, 10.

***— І якімі былі вечары там, на Танкавай?***

— У свой час я працаваў у інспекцыі Міністэрства абароны. Найцяжэйшая пасада: 22 дні ў месяц (акрамя тых, якія ў адпачынку) — у войсках. Былі ўсюды, асабліва там, дзе цяжка. Вывучалі матэрыяльнае становішча афіцэраў, іх умовы жылля. Калі сустракаліся з Васілём Быкавым, ён мяне прасіў расказаць пра тыя месцы, дзе я бываў. Дапусцім, падзяліўся сваімі ўражаннямі аб Курыльскіх астравах. Ён там, аказваецца, служыў. Я ўпершыню ад Васіля Уладзіміравіча даведаўся, што там захоўваецца зямлянка, дзе ён жыў з сям'ёй, дзе нарадзілася яго першае дзіця. «Як на Ітурупе?» — пытаецца ён, ведаючы, што я там быў. Аказваецца, ён там таксама служыў.

***— А ці ўспамінаў Васіль Уладзіміравіч вайну?***

— Вядома, падчас нашых сустрэч ён не проста расказваў пра літаратуру. Ён узгадваў тое, што было на фронце. Я вывучаў вайну з дапамогай Быкава. Аповеды франтавіка былі для мяне надзвычай каштоўнымі. Ён быў камандзірам гармат-саракапятак. Яны знаходзіліся ў кіламетры ад пярэдняга краю, найбліжэй да немцаў. Толькі танк пачынае ісці, яны абавязаны зараздзіць і знішчыць яго. Васіль Уладзіміравіч мне пра гэта расказваў, каб я лепш разумеў, што такое фронт. Я пытаўся ў яго, ці былі баязліўцы. Ён казаў, што ў яго падраздзяленні за ўсю вайну быў толькі адзін чалавек, які спалохаўся і збег. Васіль Быкаў не раз казаў, што трэба было выхоўваць не толькі страх, а цярплівасць да страху. Вайна з яго вуснаў была больш жорсткай, чым тая, якую я бачыў у фільмах. Ён расказваў настолькі па-майстэрску, што я ўбіраў усё гэта ў сябе і сам адчуваў пачуццё страху.

«Мы заўтра едзем на Буйніцкае поле, — кажа мне аднойчы Быкаў. — Месцы ёсць. Паехалі!» Паездка на Буйніцкае поле з Быкавым і з пісьменнікамі, якія пішуць пра вайну, мне помніцца і сёння. Калі экскурсавод расказвала, які там быў бой, Быкаў падышоў да яе і сказаў: «Вы дапусцілі памылку. Палкоўнік Куцепаў камандаваў на Буйніцкім полі 388-м стралковым палком. І за адзін дзень яны знішчылі 39 нямецкіх танкаў-бронетранспарцёраў». Пра Куцепава Быкаў расказаў мне тады першым. Ён мяне «ўзброіваў» ваеннай гісторыяй: разумеў, што служыць у Беларусь я прыехаў не на адзін дзень. Мы з ім два разы былі на Буйніцкім полі. Падчас адной з паездак ён выступаў перад магілёўскімі студэнтамі. Трэба было некалькі разоў прасіць, літаральна цягнуць за рукі, каб ён выйшаў да аўдыторыі... Нашы сустрэчы мяне абагачалі. Я пераносіў гэта ў войскі: перад салдатамі і афіцэрамі ў гарнізонах расказваў пра ваенны лёс Быкава, яго кнігі, прапагандаваў праўду аб вайне.

***— І наколькі я ведаю, нават абавязвалі вайскоўцаў чытаць як мага больш твораў пісьменніка...***

— Першыя месяцы, праведзеныя ў Беларусі, я шмат працаваў. Мне неабходна было пазнаёміцца з воінскімі часцямі 2-й асобнай арміі супрацьпаветранай абароны, якія, акрамя Беларусі, размяшчаліся ў Латвіі, Літве і Калінінградскай вобласці Расіі. І падчас такіх паездак я заходзіў у мясцовыя бібліятэкі і вывучаў асабістыя карткі. Мне было цікава, што чытаюць вайскоўцы. Быкава там чыталі мала. Быкаў — чалавек, які прайшоў вайну. І тое, што ён перажыў, трэба было перажыць усім, хоць і з дапамогай літаратуры. Я пачаў патрабаваць ад палітработнікаў, камандзіраў, каб яны самі чыталі кнігі і рэкамендавалі іх чытаць вайскоўцам. І праз некаторы час і ў Латвіі, і ў Літве мне пачалі паказваць кнігі Быкава, якія масава чытаюць. Мне было прыемна, і аб гэтым я расказваў Васілю Уладзіміравічу.

***— А які твор пісьменніка найбольш уразіў вас?***

— Кожную новую кнігу Васіля Быкава я спяшаўся хутчэй прачытаць. Потым мы яе абмяркоўвалі. Іншы Быкаў для мяне адкрыўся пасля таго, як я адолеў «Мёртвым не баліць». Гэтую кнігу я прачытаў з алоўкам у руках.

***— А ці дапамагаў вам, як пачынаючаму пісьменніку, майстар слова парадай?***

— Я яшчэ не ўваходзіў у Саюз пісьменнікаў, але ўжо займаўся творчасцю: пісаў аповесці. Даваў Васілю Уладзіміравічу два ці тры свае рукапісы. Ён не правіў іх, а падказваў, выказваў сваё меркаванне. «Зрабіце другую главу першай, а першую — другой», — кажа мне ён аднойчы. Зрабіў, перачытаў — сапраўды лепш выйшла. Васіль Быкаў у дэталі не ўнікаў — галоўнае, каб было цікава. Калі ж правіць, то трэба было перапісваць па-быкаўску, а я да гэтага не дарос. Безумоўна, я вывучаў тэхналогію яго пісьма. Ён пісаў толькі тое, што перажыў. Ствараў вобразы літаратурных герояў, якім верыш. Пісаў толькі праўду. Гэта ён унёс у мяне струнку, якая абавязала мяне пісаць пра армію толькі праўду.

***— Вы ведалі, што ў Васіля Быкава здаўна была астма?***

— Аднойчы мне патэлефанаваў Аляксандр Трыфанавіч Кузьмін, сакратар ЦК па ідэалогіі. «Як там у Быкава справы? — пытае. — Ён часам не захварэў? Наведай яго». Пасля службы сеў у «Волгу», паехаў. Прыходжу, націскаю кнопку званка — ніхто не адчыняе. Яшчэ некалькі разоў. Ужо сабраўся сыходзіць, як адчыняюцца дзверы, за якімі стаіць Быкаў. Але іншы: худы, аброслы, хворы. Пытаю, які дзень ён хварэе. Аказалася, чацвёрты... «А чаму ў бальніцу не звярнуліся?» «Я не люблю бальніц. Я сам сябе лячу», — адказаў мне ён. Аднойчы быў адзін эпізод, калі я вельмі спалохаўся за яго. Патэлефанаваў начальніку медслужбы, які сказаў, што неабходна ў шпіталь і неадкладна. Быкаў не паехаў, астму лячыў дома. Я за яго вельмі перажываў, хваляваўся. Пакідаў тэлефон нашага дзяжурнага ўрача, да якога ён так ніколі і не звярнуўся. Васіль Уладзіміравіч быў чалавекам вельмі сціплым.

**Здараецца, сяджу ў кабінеце, як тэлефануе Быкаў і кажа: «Мне без вас няўтульна. Калі ў мяне будзеце?» Я кідаў усе свае справы і ехаў на Танкавую, 10.**

***— Вы былі ў курсе, што ён збіраецца з'язджаць за мяжу?***

— Ён мне не сказаў, што з'язджае. Пра гэта ведалі толькі два чалавекі. У мяне захоўваюцца лісты, якія ён мне пісаў з замежжа. У адным з іх (здаецца, з Фінляндыі) мне асабліва запомнілася адна фраза. Васіль Быкаў напісаў, што чалавек часам вымушаны рабіць тое, чаго не хоча.

***— Вы потым бачыліся з Васілём Уладзіміравічам?***

— Калі Васіль Быкаў вярнуўся, мне не паведамілі. Я аб гэтым даведаўся выпадкова: ён ужо ляжаў у шпіталі. Калі яго хавалі, мы з маёй жонкай Таісіяй Іванаўнай увесь дзень прасядзелі каля яго труны. Ён настолькі быў для мяне блізкім, родным...

***— Вам не казалі, што вы вельмі падобныя з Васілём Быкавым?***

— Казалі. Толькі характары розныя. Васіль Быкаў быў больш цярплівым, а я наадварот. Тым не менш гэта не перашкаджала нам сябраваць. Бачыце *(паказвае)*, каля гадзінніка вісіць фотаздымак Васіля Быкава? Гэтаксама ў яго вісела і мая фатаграфія.

***— Васіль Быкаў прайшоў вайну, усё жыццё пра яе пісаў і памёр якраз у чарговую гадавіну пачатку Вялікай Айчыннай вайны — 22 чэрвеня 2003 года. Мне падаецца гэта глыбока сімвалічным...***

— Нехта вышэйшы намі кіруе. Нічога выпадковага не бывае. Я шчаслівы, што ў маім жыцці быў такі сябар, як Васіль Быкаў.

**Вераніка КАНЮТА.**
kanyuta@zviazda.by

**Фота з асабістага архіва Анатоля СУЛЬЯНАВА**

■ Неасабісты суб'ектыў

# Правілы паводзінаў на водах



## Пра шведскі стол, разбуджаных рыб і імідж краіны

Сяброўка, якая жыве ў Германіі, учора расказала, як яе шасцігадовая Маша з выхавацелькай у садку пасварылася. Пачало дзіця расказваць, што нядаўна ў Мінску была, у Беларусі, а фрау Сюзана запярэчыла і пачала іншым дзецям тлумачыць, што Мінск — гэта Расія, мама ў Машы — руская, а Беларусь — гэта тое ж, што ў Германіі Баварыя. Бедная малая прыйшла ў слязах і доўга не магла супакоіцца. Але маці ёй паказала карту, пашпарт, спакойна растлумачыла, што да чаго. А пасля схадзіла ў садок і правяла «лікбез» з небаракай «Сюзі», якая пасля падзякавала за навуку і прабачэння ў яе і дачкі папрасіла.

Дый што казаць пра звычайную выхавацельку, калі мінулым летам давялося прыблізна тое ж тлумачыць святару, доктару тэалогіі ў Трыры (на радзіме Карла Маркса), які ўпарта не жадаў ідэнтыфікаваць Мінск як сталіцу незалежнай краіны, а пасля гэтаксама дзякаваў і прасіў прабачэння...

Карціна, скажам шчыра, тыповая. Для большасці суседзяў па планеце жыхары постсавецкіх краін, асабліва славяне — «рускія». Прайшло дваццаць пяць гадоў, як жывём у незалежных дзяржавах, а гэты стэрэатып у свеце фактычна так і не памяняўся. У прынцыпе, у тым нічога страшнага няма, можна толькі пасмейвацца з недасведчанасці тых жа еўрапейцаў, якія далей за свой нос нічога бачыць не жадаюць. Але, калі задумацца сур'ёзна, гэты стэрэатып нам давядзецца ламаць доўга і карпатліва, бо не будзеш жа бегаць за кожнай «Сюзі» і расказваць ёй пра Беларусь як пра асобную краіну з трывалымі каранямі, самастойнай палітыкай і народам з адметнай гісторыяй і характарам.

Праблема ў тым, што мы самі не тое што не стараемся гэты стэрэатып змяніць, наадварот, нібы спецыяльна робім усё, каб яму адпавядаць. Прычым у самых дробных рысах, якія ў тых жа еўрапейцаў (і не толькі) асацыююцца менавіта з «рускімі». Я маю на ўвазе перш за ўсё нашы паводзіны на адпачынку за мяжой. Дзіўная справа: дома прыстойныя і выхаваныя людзі, мы, выехаўшы за мяжу, нібы з ланцуга зрываемся.

Зразумела на тое ён і адпачынак, каб у нечым дазволіць сабе тое, чаго не дазваляеш у працоўныя будні. Ныраць ноччу ў басейн, гарлаць песні на вуліцах соннага горада, заплыць за буйкі, яшчэ і спрабаваць уцячы ад выратавальнага катара... Што ж, такая яна шырокая, славянская душа, мы ніколі не будзем сумна-спакойнымі, як тыя ж немцы ці галандцы. Але, калі бачыш, як суайчыннікі на шведскім (бясплатным!) сталлі ў пяцізоркавым гатэлі набіраюць у талеркі зараз столькі, што ледзь цягнуць паднос, як хапаюць порцыямі таннае спіртное мясцовай вытворчасці (менавіта яно налiваецца задарма па сістэме «усё ўключана»), як літаральна б'юцца раніцой за «халяўны» шэзлонг на пляжы, як у самалёце хваляцца «спёртым» у тым жа гатэлі ручніком, аднаразовымі тапачкамі, пакецікамі з гелямі для душу і шампунем... Як у тым старым анекдоце — «вось за гэта нас і не любяць».

Так, не любяць, пабойваюцца і церпяць, бо прывозім грошы. Паважаюць? Наўрад ці. Для тых, каго паважаюць, румынскія фермеры не пісалі б па-руску: «Просьба в кукурузе не с...», у турэцкім гатэлі не вывешвалі б на багатым прыгожым акварыуме плакат «Пожалуйста, не будите рыб», у туніскім Манасціры не падганялі б да самалёта з Мінска або Масквы (і ў апошніх беларусаў хапае) разам са звычайнымі надзімаными трапы — бывалі выпадкі, калі пасля чатырохгадзіннага пералёту амаль увесь самалёт прыбываў у такім «цвярозым» стане, што даводзілася спускаць іх па аварыйным варыянце. Жанчын, якіх паважаюць, не абзывалі б скрозь «наташамі» і не вылівалі б ім пад ногі памыі на вуліцах... І каму і як даказваць, што ты — з Беларусі, што ёсць такая краіна — еўрапейская, цывілізаваная, у якой жывуць культурныя, адукаваныя людзі? Калі фонам да гэтага будзе гучаць брыдкаслоўе — гэта нашы кабеты, што выехалі ў тур па Еўропе, не падзялілі танную шмотку на тамтэйшым распродажы...

Імідж краіны за мяжой, па сутнасці, фармiруюць не толькі палітыкі, бізнесмены, спартсмены. Паводзіны, словы, учынкі кожнага з нас паасобку — яго неад'емныя складнікі.

Пісаць бы гэта на ўсіх турыстычных пуцёўках вялікімі літарамі побач з заманлівым «усё ўключана».

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** alena@zviazda.by

TV@R

Тамара ВЯЦКАЯ:

# «ЭФІР ВАРТА ЎПРЫГОЖВАЦЬ ГАЛАСАМІ»

**Нядаўна дырэктарам радыё «Мінская хваля» прызначылі Тамару Вяцкую — таленавітага журналіста, вопытнага арганізатара, клапатлівую маму, мілавідную жанчыну і рашучага чалавека. Пра што сведчаць некаторыя факты яе біяграфіі.**


Фота Надзеі БУЖАН.

Нарадзілася Тамара Вяцкая ў маленькім палескім гарадку ва Украіне. Там скончыла школу. У Беларусь прыехала з дзесяццю рублямі і зубной шчоткай у партфелі. Завочна вучылася ў політэхнічным, але «не склалася», уладкавалася на працу ў самы складаны цэх Мінскага трактарнага завода. Працавала на цяжкім штампе і... пісала вершы. Потым паступіла ў Белдзяржуніверсітэт, на першым курсе нарадзіла першае дзіця, на другім — другое. Пасля заканчэння факультэта журналістыкі пачала працаваць уласным карэспандэнтам Беларускага радыё, якому аддала 12 гадоў, сумяшчаючы гэтую пасаду з работай на «Маяку» — для ўсенародна любімага тады радыёканала рыхтавала паўгадзінныя штотыднёвыя праграмы пра Беларусь. Нарадзіўшы трэцяе дзіця, разышлася з мужам, сышла ў тэлерадыёкампанію «Мір», якая толькі стваралася. СССР на той час ужо распаўся. Працавала 12 гадоў палітычным аглядальнікам, выдала дзве кніжачкі вершаў і прозы, зняла дакументальныя фільмы «Раскаванае земляробства» і «Працягваем ваяваць». У 2007-м была прызначана першым намеснікам старшыні ТРА Саюз (тэлеканал «Беларусь-Расія»).

Акрамя адміністрацыйнай працы, займалася творчасцю — вяла тэлепраграмы пра паспяховых жанчын «Кава-перапынак з Т.В.», «Панарама з Тамарай Вяцкай», «ТРАСА М1», напісала сцэнарыі і зняла дакументальныя фільмы «10 гадоў. Працяг будзе», «Уся надзея — на аркестр», «Адкрыты ўрок», «Аднагалосна — значыць, аднадушна», «Канцэрт для Германіі з аркестрам», «Вялікая музыка для вялікай Брытаніі», «Прыцяжэнне Альберта Вейніка» і іншыя. З 2013 года працавала на Грамадскім тэлебачанні Расіі.

***— Тамара Рыгораўна, на новай пасадзе вы нядаўна. Якія першыя ўражанні?***

— Радыё «Мінская хваля» для мяне, прызнаюся шчыра, — асабістае адкрыццё. Мне даводзілася часта ездзіць у Атоліна, што пад Мінскам, на маршрутцы. І заўсёды на будынку №5 па вуліцы Чкалава чытала шыльду з надпісам «Мінская хваля». Потым прыгадала, што тут працуе мая знаёмая. Калі прапанавалі ўзначаліць калектыў гэтага радыё, то ў мяне нават шоку не было. Відаць, «Мінская хваля» цэлы месяц траплялa мне на вочы невыпадкова *(смяецца)*. Мяркую, калі ты даў згоду і ідзеш кудысьці працаваць, то пачынаеш як бы ўлюбляцца ў новае месца работы. Інакш нельга, гэтак жа як немагчыма ні жыць, ні сябраваць з нелюбімым чалавекам. Не варта і працаваць на той рабоце, якую не любіш...

Пазнаёмілася ўжо практычна з усімі супрацоўнікамі. Слухаю некаторых — добры голас! Як прафесіянал, не разумею, чаму ён дагэтуль не гучыць у эфіры. У мяне такое адчуванне, што хутка мы ў эфір «Мінскай хвалі» пойдзем дружнай камандай: і дырэктар, і намеснікі. Эфір варта ўпрыгожваць галасамі. Бо што такое радыё? Для мяне яно, мабыць, гадоў з 18 — суразмоўца, выратаванне ад адзіноты, нават лекар, калі на душы неспакойна. Як толькі ўключаеш любую радыёхвалю, паверце, побач з вамі з'яўляецца сябар. У «Мінскай хвалі», на шчасце, вельмі добрая гісторыя. У верасні нам спаўняецца 11 гадоў. Галасы, што тут гучаць, добра вядомыя і пазнавальныя для аўдыторыі. І я хачу, каб «Мінская хваля» стала добрым, сапраўдным таварышам для ўсіх слухачоў.

***— І ўсё ж, Тамара Рыгораўна, на вашу думку, чаго не хапае «Мінскай хвалі»?***

— Мне здаецца, тут нестае душэўных, аналітычных праграм. Усё гэта калісьці, мабыць, было ды, як кажуць, сплыло. Тое добрае, вартае ўвагі, што забылася, мы вернем. Гэта цалкам магчыма: усе пытанні ў калектыве вырашаюцца калегіяльна, праз экспертны савет. Спадзяюся, такая практыка захаваецца і надалей.

І вось яшчэ чаго хочацца ад супрацоўнікаў. Калі я працавала ў эфіры, то разумела, што перада мной не чорны мікрафон. Я ўяўляла, што недзе бабуля сядзіць каля прыёмніка. У яе нестае здароўя, сіл нават на тое, каб звязаць шкарпэткі, але яна слухае радыё. Або — маладая мама, якой трэба закалыхаць дзіцятка, і яна ціхенька ўключыла радыё, каб не патурбаваць малое. Я папрасіла сваіх работнікаў павесіць у студыі фота тых людзей, якіх яны любяць. Няхай гэта будуць бабуля, дзядуля, маці, бацька, каб уяўлялі, што вядуць перадачу для іх, родных і блізкіх, размаўляюць з імі.

Дадам, што ўсе мае намеснікі, супрацоўнікі выказваюць і свае прапановы. І гэта радуе, калі ты прыходзіш, зрэшты, у стабільны калектыў, дзе ў кожнага чалавека ёсць творчыя задумы, ідэі.

***— Новая мятла па-новаму мяце. А вы, Тамара Рыгораўна, падпадаеце пад гэтую прымаўку?***

— З псіхалагічнага пункту гледжання можна з гэтым пагадзіцца. Кожнаму кіраўніку хочацца камфортнай работы, хочацца працаваць з тымі, хто лепшы за яго. Магчыма, гэта толькі маё асабістае меркаванне. Прафесіяналаў цэняць у любым калектыве, у любой галіне дзейнасці. Аднолькава — і токара, і журналіста. Быць кіраўніком — гэта таксама талент, прычым вельмі рэдкі. На жаль, нярэдка бывае, што хтосьці не спраўляецца са сваімі абавязкамі, але яго... рухаюць наверх, каб не псаваў справу. І ён становіцца кіраўніком. Спадзяюся, што я не з такіх і да таго ж прафесіянал у журналістыцы. А калектыў у нас добра падабраны, за што дзякуй маім папярэднікам і стваральнікам радыё.

**Быць кіраўніком — гэта таксама талент, прычым вельмі рэдкі. На жаль, нярэдка бывае, што хтосьці не спраўляецца са сваімі абавязкамі, але яго... рухаюць наверх, каб не псаваў справу.**

Калі сёння стаіць задача зарабляць грошы, то будзем імкнуцца развіваць рэкламную дзейнасць, даносіць да ўсіх, што на радыё «Мінская хваля» вельмі ўдалая, паспяховая, правільная рэкламная стратэгія. На рэкламу ў некаторых няправільны погляд, лічыцца, што радыё прадае з дапамогай рэкламы нейкі прадукт. Няпраўда, мы знаёмім з ім сваю аўдыторыю, і гэта важна зразумець. Чым большая аўдыторыя, тым больш рэкламадаўцаў да нас прыйдзе са сваім прадуктам. І наша мэта — як мага большай колькасці людзей даць правільнае разуменне, што яны могуць купіць, каб іх жыццё стала лепшым, лягчэйшым, радаснейшым. Задача «Мінскай хвалі» — прыйсці ў кожны дом, зрабіць новы дзень чалавека прыемным.

***— Поспехаў вам на новым месцы працы.***

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

■ Заўсёды ў сэрцах

## ГЭТА ТРЭБА ЖЫВЫМ

**Да памятнай даты 22 чэрвеня і Дня ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны тэле- і радыёканалы галоўнага медыяхолдынга краіны падрыхтавалі тэматычны эфір.**

**19 чэрвеня пасля «Панарамы»** гледачы ўбачаць ваенную **драму «Перакладчык»** (Расія, 2013). 1941 год. Нямецкія войскі захапілі Таганрог. Настаўнік хіміі Андрэй Сцяпанавіч Старыкаў, якога мясцовыя жыхары празвалі «перакладчыкам» за яго любоў да фільмаў Чарлі Чапліна, вымушаны супрацоўнічаць з фашысцкімі акупантамі, каб захаваць жыццё сваёй цяжарнай жонцы, суседзям і вучням. Паколькі Старыкаў добра валодаў нямецкай мовай, яго выкарыстоўвалі ў якасці перакладчыка на допытах. Зверствы нацыстаў, іх здзекі з палонных, сведкам якіх становіцца галоўны герой, пачуццё віны перад суайчыннікамі за дапамогу ворагу прыводзяць да таго, што сарамлівы школьны настаўнік уступае ў непрымірымую барацьбу з акупантамі...

**21 чэрвеня ў вячэрнім эфіры** ваенную тэму працягне **драма «Шпіталь»** (Расія, 2011). Фільм расказвае пра падзеі 1946 года, калі выпускніца сталічнага медыцынскага інстытута Іна Кузняцова прыязджае па размеркаванні на сакрэтны аб'ект у Разанскай вобласці — шпіталь для нямецкіх ваеннапалонных, якія працуюць на шахце. Дзяўчына абурана, як можна лячыць і ратаваць жыццё ўчарашніх ворагаў, аднак паступова прыходзіць разуменне, што перад ёй проста хворыя людзі, якім патрабуецца дапамога. І тады словы «міласэрнасць» і «ўрачэбны доўг» набываюць рэальны сэнс.

**22 чэрвеня ў 22.00 на «Беларусь 1» пачнецца прамая трансляцыя мітынгу-рэквіема «Вароты памяці»,** прысвечанага ўрачыстаму адкрыццю мемарыяльнага комплексу на месцы лагера смерці «Трасцянец»... 14 мая 2007 года пастанаўленнем Савета Міністраў тэрыторыя былога лагера смерці Трасцянец занесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў, а адкрыццё мемарыяльнага комплексу прымеркавана да 70-годдзя Вялікай Перамогі.

**Тэлеканал «Беларусь 3»** таксама пакажа шэраг фільмаў, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне. **19 чэрвеня ў 21.10,** у дзень нараджэння народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава, увазе тэлегледачоў будзе прадстаўлены **дакументальны фільм «Васіль Быкаў. Франтавыя старонкі»** (Белвідэацэнтр, 2004), а працягне вечар **у 21.40 паказ драмы Ларысы Шапіцькі «Узыходжанне»** (СССР, 1976), знятай па матывах аповесці «Сотнікаў».

**20 чэрвеня ў 9.40** у эфіры нас чакае **карціна «Жывыя і мёртвыя»** (СССР, 1963) па аднайменным рамане Канстанціна Сіманава. **22 чэрвеня** адбудзецца **прэм'ера трохсерыйнага дакументальнага цыкла «Доблесць зямлі беларускай»** (Ваен—ТБ, 2014).

**У 15.10** паглядзім **фільм** Барыса Галкіна «**... 22 чэрвеня, роўна ў 4 гадзіны...**» (Расія, 1992), а **ў 16.45** на канале яшчэ адна прэм'ера — **дакументальны фільм «Якаў Крэйзер. Забыты генерал»** (Расія, 2015).

**Тэлеверсію мітынгу-рэквіема з Брэсцкай крэпасці,** прымеркаванага да 74-й гадавіны пачатку вайны і абароны гераічнай цытадэлі, глядзіце на «Беларусь 3» у 23.00. Завершыць эфір у 23.40 дакументальны фільм **«Беларусь. 4 гады вайны»** («Беларусьфільм», 2002).

Тэматычны эфір 22 чэрвеня таксама запланаваны і на радыё. **На Першым нацыянальным** адной з асноўных тэм стануць мітынгі-рэквіемы «Вароты памяці» і ў Брэсцкай крэпасці. Запланаваны і прамыя ўключэнні з месцаў падзей.

**Радыё «Беларусь»** прадставіць увазе слухачоў тэматычныя праграмы з падборкай цікавых фактаў, апытанняў, успамінаў ветэранаў на беларускай, рускай, польскай, англійскай і нямецкай мовах.

На радыё **«Культура»** працягнецца **чытанне рамана Уладзіміра Багамолава «У жніўні 44-га».** А радыёстанцыі **«Сталіца» і «Радыус FM»** будуць асвятляць Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны ў выпусках навін.

**Алена ДРАПКО.**
*drapko@zviazda.by*


## На арэлях лета — з любімай газетай!

**КАЛІ ВЫ ПАДПІСАЛІСЯ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»**

**на III квартал або II паўгоддзе 2015 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце**
**ДА 14 ЛІПЕНЯ 2015 ГОДА**
**ў рэдакцыю на адрас:**
**220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.**




Сярод падпісчыкаў 16.07.2015 г. будзе разыграна 7 падвесных крэслаў-гамакоў і суперпрыз — садовыя арэлі. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 26.07.2015 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 30.09.2015 г. пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на III квартал або II паўгоддзе 2015 г. і пашпарта. Пасля 30 верасня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Умовы рэкламнай гульні «Са «Звяздою» — лета ў радасць!» чытайце ў №101 газеты «Звязда» за 30.05.2015 г.

**Тэлефон для даведак (017) 284 44 04.**
**ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ ГУЛЬНІ — З 01.06.2015 ПА 30.09.2015.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №2568 ад 25.05.2015, выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь

**ПРЫЕМНАЯ НАВІНА —**

**цэны на падпіску на газету «Звязда» на другое паўгоддзе засталіся ранейшымі!**

**Заставайцеся з намі — будзе цікава!**

**6 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2015 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ______________________

______________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ______________________
(аддзяленне сувязі)
______________________ на III кв. або 2–е паўг. 2015 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) [ ] (індэкс) ______________________

______________________

______________________

Удачы ў розыгрышы!

## Zамор'е

### ПЯРСЦЁНКІ ЎСЁВЕДАННЯ

**Брытанскі ювелір і заснавальнік брэнда Gemporia Стыў Бенет стварыў пярсцёнкі для заручынаў, абсталяваныя GPS-сістэмай.**



Упрыгажэнні атрымалі назву «пярсцёнкі вернасці». Паводле задумы дызайнера, асноўным прызначэннем убудаваных ва ўпрыгажэнні мініяцюрных чыпаў стане абарона ад крадзяжу або страты каштоўнай рэчы. Аднак аўтар навінкі дапускае, што яны будуць карыстацца попытам у раўнівых мужоў, якія хочуць заўсёды ведаць пра месцазнаходжанне другой паловы. Бенет ствараў пярсцёнкі ў двух варыянтах: з класічным празрыстым дыяментам агранкі «прынцэса» і з фіялетавым дыяментам агранкі «маркіз». Кошт каштоўнасцяў не ўдакладняецца.

### ПЕРШАЕ ЗЛАЧЫНСТВА ЗА ПАЎСТАГОДДЗЯ

**На шатландскім востраве Кана адбылося першае за 50 з лішнім гадоў злачынства. Здабычай зладзеяў, якія залезлі ў краму ноччу, стала шэсць капелюшоў, цукеркі, кава і печыва.**



Прадстаўніца супольнасці землеўладальнікаў вострава заявіла, што цяпер прыйдзецца звярнуцца да радыкальных захадаў, каб прадухіліць далейшыя крадзяжы на Кане. «Гэта азначае, што мы будзем вымушаны замыкаць дзверы па начах. Раней мы пакідалі іх адамкнёнымі, каб рыбакі маглі скарыстаца Wi-Fi або купіць штосьці для адпачынку», — адзначыла прадстаўніца супольнасці. Папярэдняе злачынства на востраве адбылося ў 1960 годзе. Тады была скрадзеная драўляная талерка.

На размешчаным за 40 кіламетраў ад паўночна-заходняга ўзбярэжжа Шатландыі востраве Кана няма аддзялення паліцыі. Усяго тут пражывае каля 30 чалавек, на востраве таксама ёсць ферма з 50 каровамі.

Кана вядомы яшчэ тым, што ў 2013 годзе мясцовыя жыхары пасказдзіліся на разбуральную актыўнасць трусоў. Тады каля 16 тысяч гэтых жывёл пракапалі велізарную колькасць нор і сталі прычынай апоўзня, якія заблакавалі адзіную на востраве дарогу на тры дні.

### ЗАСТАЎСЯ ЖЫВЫМ

**У амерыканскім штаце Арызона мужчына выжыў пасля таго, як яго ўкусілі каля тысячы пчол.**



Паводле звестак уладаў, пацярпелы працаваў на ўчастку, дзе, верагодна, патрывожыў вулей. На яго напалі раз'юшаныя пчолы. На шчасце, ён паспеў дабегчы да сваёй машыны. У выніку чалавека даставілі ў бальніцу, цяпер ён знаходзіцца ў стабільным стане. Пацярпелі ад пчол і двое людзей, якія дапамагалі яму, але ім шпіталізацыя не спатрэбілася. Выкліканы на месца здарэння пчаляр таксама атрымаў 23 укусы. На яго думку, на тое, каб пчолы супакоіліся і вярнуліся да звычайнага жыцця ў вуллі, спатрэбіцца некалькі дзён.

**Іван КУПАРВАС,**
*hvir@zviazda.by*

## НЯДЗЕЛЯ, 28 ЧЭРВЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.20 Меладрама «Любімыя жанчыны Казановы». 2-я серыя.**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал».
**9.40, 0.45 Камедыя «Кухня».**
**10.45** «Пра ежу!».
**11.20** XXL WOMAN TV.
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35** Зона Х. Вынікі тыдня.
**13.05** Тайны следства.
**13.40** Каробка перадач.
**14.15** Вакол планеты.
**15.15** Твой горад.
**15.30 Меладрама «Чалавечы фактар». 1-я і 2-я серыі.**
**18.55** Першыя Еўрапейскія гульні ў Баку-2015. Урачыстая цырымонія закрыцця.
**21.20** Галоўны эфір.
**22.15** Навіны надвор'я.
**22.35** Дыялогі пра цывілізацыю.
**23.05 Меладрама «Зваротны білет».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**6.55** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**8.10, 21.40 Серыял «Шчаслівыя разам».**
**10.00** Я хачу гэта ўбачыць!
**10.35, 20.05** Тэлебарометр.
**10.40** «Зразумець і абясшкодзіць».
**11.20** Ваша лато.
**11.50** Латарэя «Пяцёрачка».
**12.00** Хачу ў тэлевізар!
**12.10 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**14.10 Камедыя «Прыкінься маёй жонкай».**
**16.10 Трылер «Закладніца».**
**17.55** «Comedy woman».
**19.15** Суперлато.
**20.40** Кіпень.
**21.00** Рэальны свет.
**21.35** Спортлато 5 з 36, КЕНО.

**23.30** Першыя Еўрапейскія гульні ў Баку-2015.

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.45, 11.40, 15.55, 0.10** Калейдаскоп.
**7.55 «Імперыя. Пачатак». Драма. Часткі 1-я і 2-я.**
**9.40** «Подых струн». Музычная праграма. Госць: Віктар Мацькуноў (Гомель).
**10.20** «Наперад у мінулае».
**10.45, 21.00** Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».
**11.50, 21.55 «Пацалунак Сакрата». Серыял. Фільм чацвёрты «Чысты лёд». 1-я і 2-я серыі.**
**13.25** «Музеі Беларусі». Мастацкая галерэя Міхаіла Савіцкага.
**13.55** «Грані Перамогі». Салюты Перамогі. Дак. фільм.
**14.20** Беларуска-сербскі тэатральны праект «Белыя журавы». Рэжысёр — Івана Жыган (Сербія), харэграфія — Бранімір Джурычыч (Сербія).
**15.30 «Камертон». Актрыса, сцэнарыст, рэжысёр Івана Жыган.**
**16.05 «Кромвель». Драма.**
**18.20, 23.35** «Культпрасвет».
**18.55 «Ніхто, акрамя нас». Драма.**
**20.45** Калыханка.

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.00, 0.30** PRO спорт. Навіны.
**7.15, 0.15** Першыя Еўрапейскія гульні. Баку-2015. Вынікі дня.
**7.30** Тэніс. Турнір ВТА. Істбарн. Фінал.
**9.30** Першыя Еўрапейскія гульні. Баку-2015. Дзюдо.
**10.55, 17.55** Першыя Еўрапейскія гульні. Баку-2015. Валейбол. Мужчыны. Фінал.
**13.00** Першыя Еўрапейскія гульні. Баку-2015. Дзюдо. Фінал.
**15.00, 23.05** Першыя Еўрапейскія гульні. Баку-2015. Пляжны футбол. Фінал.
**16.10** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Белшына» (Бабруйск) — «Дынама» (Мінск).
**19.55** Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Фінал.
**21.50** Формула-Е. Гран-пры Лондана.

### АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
**9.20** М/с «Смяшарыкі. ПІН-код».
**9.35** «Іна Чурыкава. «Не прынцэса! Каралеўна!!!»
**10.35** «Фазэнда».
**11.10** «ДОстояние РЕспублики: Ігар Нікалаеў».
**13.10 Серыял «Маскоўская сага».**
**16.15** Навіны спорту.
**16.20, 22.00** «Музычныя вечары ў Мірскім замку». Канцэрт «Песня года Беларусі 2015».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Вызваленая Еўропа».
**23.15** «Што? Дзе? Калі?».
**0.25 Маст. фільм «Праклятыя шляхі».**



### СТБ

**6.00 Серыял «Студэнты International».**
**7.25** «Скардзіцца дазваляецца».
**7.45, 16.50** «Аўтапанарама».
**8.10 Маст. фільм «Гран Тарына».**
**10.10** «Чыстая праца».
**11.00** «Вялікае снеданне».
**11.40 Серыял «Салдаты 2».**
**13.30, 16.30** «24 гадзіны».
**13.40, 0.50 Маст. фільм «Школа зладзеяў 2».**
**15.30** «Дарагая перадача».
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**17.20** «Ваенная тайна».
**19.30** «Тыдзень».
**20.25 Маст. фільм «Герой яе рамана».**
**22.15** «Званая вячэра». Самыя яркія тыдні.
**0.00** «Маска. Дзень і ноч».

### МІР

**6.00** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**6.10** М/ф.
**7.15 Маст. фільм «Залатавалоска».**
**9.05** «Ведаем рускую».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Чаму я?».
**10.45 Серыял «Багатая Маша».**
**14.15 Маст. фільм «Лёгкія паводзіны».**
**16.15, 22.15 Серыял «Крыху не ў сабе».**
**21.00** Выніковая «Разам».
**23.15 Маст. фільм «Адаптацыя».**
**1.30 Маст. фільм «Сабрына».**
**3.35 Маст. фільм «Адна памылка».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00, 15.45** «Ха».
**7.40 Маст. фільм «Дзеравеншчына».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.15** «Планета сабак».
**11.50** «Смехапанарама».
**12.20** «Ранішняя пошта».
**13.00** «Пакой смеху».
**14.15** «Кулінарная зорка».
**15.15** М/ф.
**16.30 Камедыя «Асцярожна, бабуля!».**
**18.10** «Смяяцца дазваляецца».
**20.00** Весткі тыдня.
**21.50 Маст. фільм «Не ў хлопцах шчасце».**
**23.40** «Нядзельны вечар».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.10, 8.20 Серыял «ППС».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.55** «Медыцынскія тайны».
**9.25** «Ядзім дома».
**10.25** «Першая перадача».
**11.05** «Цуд тэхнікі».
**11.50** «Дачны адказ».
**13.20** «Я хуДзею».
**14.15 Серыял «Каця».**
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень.
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00 Маст. фільм «Ідэальнае забойства».**
**21.35 Маст. фільм «Рускі характар».**



**23.15** «ГРУ: Тайны ваеннай разведкі».

### 8 КАНАЛ

**9.00, 15.40, 19.00, 21.05** «Надвор'е».
**9.05** Мультпарад.
**10.00** «Адшукваецца адпачынак».
**10.30, 13.30, 17.10, 21.00** «Хатняя крама».
**10.45, 23.30** «Хобі TV».
**11.35 Трылер «Рыцар дня».**
**13.40 Камедыя «Элізабеттаун».**
**15.45 Камедыя «Людзі ў чорным».**
**17.40 Серыял «Каломба».**
**19.05 Камедыя «Усё дзеля цябе».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Драма «Апакаліпсіс».**

### ВТБ

**6.00, 5.20** «PLAY».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**8.00, 15.30** Серыял «Ералаш».
**9.00** Серыял «Вароніны».
**10.00, 2.00** «Турбаміксер».
**12.00** Серыял «Сямейны бізнес».
**13.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**13.30** «Паспець за 24 гадзіны».
**14.30** «Рублёва—Бірулёва».
**16.00, 1.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**16.30** Трылер «Ілюзія падману».
**18.40** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**19.00** «Уральскія пельмені».
**20.30** «Ленінградскі Stand-up клуб».
**21.30** Трылер «Стукач».
**0.00** Скетчком «Студэнты».
**0.30, 4.30** «Лаві момант».
**1.00** «Нерэальная гісторыя».
**5.00** Серыял «Паласатае шчасце».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт».
**10.35, 23.55** «Шаснаццатая вясна». Маст. фільм.
**12.00** «Легенды сусветнага кіно». Джэк Нікалсан.
**12.30** «Расія, любоў мая!». «Жыццё хантаў».
**13.00** Геніі і ліхадзеі. Валяр'ян Зубаў.
**13.30** Краіна птушак. «Вароны вялікага горада». Дак. фільм.
**14.25** «Пешшу...». Масква бронзавая.
**14.55** Юрыю Візбару прысвячаецца... Вечар бардаўскай песні.
**16.10** Да 85-годдзя з дня нараджэння Барыса Рыцарава. «Па той бок казкі». Дак. фільм.
**16.50** «Вучань лекара». Маст. фільм.
**18.00** «Кантэкст».
**18.40** Сусветная выстава ЭКСПА-2015 у Мілане.
**18.55** Рэнца Арбора і «Італьянскі аркестр». Канцэрт у Дзяржаўным Крамлёўскім палацы.
**20.10** «Сорак першы». Маст. фільм.
**21.40** «Шэдэўры сусветнага музычнага тэатра». Опера Дж. Пучыні «Багема». Зальцбургскі фестываль, 2012 год.
**1.20** «Анарэ дэ Бальзак». Дак. фільм.
**1.30** «І смех, і грэх». «Прусак». «Фатум». М/ф для дарослых.
**1.55** «Шукальнікі». «Свяшчэнная тайна Сібіры».
**2.40** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00, 12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1966. 3-я і 4-я часткі. Паўтор ад 2009 года.
**6.45, 8.20, 9.40, 12.45, 13.50, 17.40, 18.40, 21.15, 23.30, 0.05, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.00** Маст. фільм «Крок з даху».
**8.40** М/ф «Як вожык і медзведзяня сустракалі Новы год».
**8.45** М/ф «Як неслі стол».
**9.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00** «Колба часу».
**11.00** Фільм-канцэрт Б. Грабеншчыкова і яго групы «Акварыум». 1990 год.
**13.00** Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». Андрэй Міронаў.
**14.50** М/ф «Музычныя казкі». 1977 год.
**15.00** «Быў час». 1991 год.
**18.00** «Акулы пяра». Наталля Мядзведзева. 1995 год.
**19.00** «Дзве гадзіны з бардамі». Фільм-канцэрт. 1987 год.
**21.00** М/с «Прыгоды Рэкса».
**22.00** Маст. фільм «Дзёрскасць».
**0.00** «Прэс-экспрэс». 1995 год.
**1.00** Маст. фільм «Кожны дзень жыцця».
**2.40** М/ф «Чараўнік Ох».
**4.00** «Народжаныя ў СССР».
**5.20** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». С. Піляўская, У. Зельдзін, К. Лучко.

### EUROSPORT

**4.00, 16.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. 1/4 фіналу.
**9.30** Настольны тэніс. Японія. Фіналы.
**12.00** WATTS.
**12.30** Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
**15.30, 19.45** Тэніс. «Матс пойнт».
**18.45** Тэніс. Турнір АТР. Фінал.
**20.15** Аўта- і матаспорт.
**20.30, 21.55** Конны спорт.
**20.35** Конны спорт. Манака.
**21.45** Конны спорт. Скачкі. Агляд тыдня.
**22.00** Бокс.
**0.00** Футбол. Старэйшая ліга футбола. «New York City FC» (ЗША) — «Нью-Ёрк Рэд Булз» (ЗША).
**2.00** Футбол. Старэйшая ліга футбола. «Portland Timbers» (ЗША) — «Seattle Sounders FC» (ЗША).

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 9.40, 17.40, 22.00, 3.10** Серыял «Шчаслівыя ў разводзе».
**6.45** Камедыя «Таксі 2».
**8.15** Камедыя «Няўдачлівыя».
**10.25** Камедыя «Модная штучка».
**12.10** Камедыя «Вайна гузікаў».
**14.00, 14.45, 15.25** «Камедыянты (Шоу)».
**14.25, 15.10, 20.00, 22.50, 0.50, 2.55** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Горка».
**18.25** Камедыя «Канікулы Дзюкабіо».
**20.20** Камедыя «Таксі 3».
**23.10** Камедыя «Мамчын сынок».
**1.15** Камедыя «Хросныя таты».
**4.00** Прыгоды «Астэрыкс і Абелікс у Брытаніі 3D».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.55, 5.15** «Нераскрытыя тайны».
**10.50** «Паненка і кулінар».
**11.25, 1.55** Серыял «Каменская».
**15.15** «Сто пытанняў даросламу».
**16.05** «Жонка. Гісторыя кахання».
**17.25** «Без падману».
**18.15** Дак. фільм «Здраднікі. Тыя, ад каго не чакаеш».
**19.50** «Доказ віны».
**20.40** Маст. фільм «Разумніца Уіл Ханцінг».
**23.00** «Асцярожна, махляры!».
**23.30** «Часова даступныя».
**0.25** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

### ТБ1000

**6.20** Камедыя «Лак для валасоў».
**8.30** Драма «Вялікія надзеі».
**10.40** Меладрама «Цяпер самы час».
**12.30** Фэнтэзі «Цудоўныя стварэнні».
**14.40, 4.25** Драма «Снежань».
**16.20** Меладрама «Бурлеск».
**18.30** Камедыя «Справа ў табе».
**20.00** Баявік «Галодныя гульні».
**22.25** Прыгоды «Галодныя гульні: І ўспыхне полымя».
**0.55** Дэтэктыў «Начны цягнік да Лісабона».
**2.50** Драма «Усё самае лепшае».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Баявік «Брат 2».
**8.30** Драма «Аты-баты, ішлі салдаты...».
**10.00** Меладрама «Федзька».
**11.30** Прыгоды «Андэрсен. Жыццё без кахання».
**13.55** Баявік «Небяспечныя гастролі».
**15.25** Трагікамедыя «Не думай пра белых малпаў».
**17.25** Камедыя «Дублёр».
**18.55** Драма «Размова».
**20.20** Камедыя «2 дні».
**22.00** Баявік «Васьмёрка».
**23.30** Драма «Туман».
**2.20** Драма «Туман 2».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Мегазаводы.
**6.45** Зрабі або памры.
**7.10** Гульні розуму.
**7.30** Займальная навука.
**7.55** Панарама 360°.
**8.40** Космас: Прастора і час.
**9.25** Навука будучыні.
**10.10** Папулярная навука.
**10.55, 5.15** Навуковыя недарэчнасці.
**12.30** Картачны штукар.
**13.15** Гісторыя ежы.
**14.00** Вялікія рэйды Другой сусветнай вайны.
**14.45** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**15.35** Апошні тыгр Суматры.
**16.20** Дзікая прырода Амазонкі.
**17.10** Ізумруд за 400 мільёнаў долараў.
**17.55, 3.45** У пошуках да Вінчы.
**18.40** Землятрус на Эверэсце.
**19.30** Хрустальныя чэрапы.
**20.15, 23.15, 2.15** Смяротны бой дыназаўраў.
**21.00, 0.00, 3.00** Топ-10 мегамонстраў.
**21.45, 0.45** Дагістарычныя монстры Гітлера.
**22.30, 1.30** Расійскія сакрэтныя матэрыялы.
**4.30** Замагільны свет Егіпта.

### DISCOVERY

**8.00** Гаражнае золата.
**8.50, 18.00, 2.20, 5.36** Стальныя хлопцы.
**9.40** Паляўнічыя на склады.
**10.30** Рукатворныя цуды.
**11.20** Аэрапорт знутры.
**12.10, 3.10** Аляска: сям'я з лесу.
**13.00** Выжыць разам.
**13.50** Бар на заказ.
**14.40** Мужчынскія бярлогі.
**15.30, 22.10** Хуткія і гучныя.
**16.20, 23.00** Горш не бывае.
**17.10, 23.50** Эфект Карбанара.
**20.30** Залатая ліхаманка.
**0.40** Рэальныя дальнабойшчыкі.
**1.30** Поўны фарсаж.
**4.00** Аляска: апошні рубеж.
**4.48** Як гэта ўстроена?
**5.12** Як гэта зроблена?

■ Сацыяльны клопат

# ВАЛЬС НА ДВУХ КОЛАХ І ТЭАТР ДЛЯ ЎСІХ

## Як працуюць творчыя гурткі для маладых інвалідаў?



Выхаванец сталічнага дома-інтэрната для дзяцей-інвалідаў Паша выконвае песню «Тры танкісты».

**Кажуць, мастацтва лечыць. Прынамсі, даследаванняў і шчаслівых выпадкаў, якія сцвярджаюць гэты факт, хапае. Творчасць нездарма застаецца важным напрамкам у рэабілітацыі дзяцей і маладых інвалідаў. «Праца, скіраваная на тое, каб павысіць якасць жыцця такіх дзяцей, прадугледжвае шмат аспектаў, — кажа дырэктар сталічнага дома-інтэрната для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця Валерый СЯЎЦОЎ. — Гэта і медыцынская дапамога, і педагагічная дзейнасць. Творчасць — толькі адзін са складнікаў, але пераацаніць яго ўплыў і магчымасці нельга».**

Заняткі музыкай ці маляваннем спрыяюць развіццю не толькі творчых здольнасцяў дзіцяці, але і навыкаў самаабслугоўвання. Так маленькіх выхаванцаў рыхтуюць да пераводу ў дарослы інтэрнат. Валерый Генадзевіч мяркуе, што галоўнае — ісці ад дзіцяці. Адштурхоўвацца ад таго, што яно ўмее, і паступова павялічваць складанасць заданняў. Тонкасцям тэатральнага майстэрства ў мінскім інтэрнаце, напрыклад, навучаюць прафесійныя акцёры, сярод якіх — Аляксандр Жданові́ч (у дзіцячым асяроддзі больш вядомы як Маляваныч).

— Калі пачынаем працаваць з малым, мы павінны разумець, чаго ён хоча. Не навязваць свайго бачання. Творчасць — гэта ж, у першую чаргу, праява індывідуальнасці. Вялікіх поспехаў дасягнуць хутка немагчыма. Гэта штодзённая карпатлівая, падчас незаўважная, праца, — адзначае Валерый Сяўцоў.

Івянецкі дом-інтэрнат для дзяцей з асаблівасцямі фізічнага развіцця вядомы сваёй танцавальнай парай. Каця і Вадзім, вучні восьмага класа, вальсуюць на калясках. Прыгожа, упэўнена, эмацыйна. **Выхавальніца Івянецкага інтэрната Алена АБРАМОВІЧ** расказала, што вальс стаў першым нумарам гэтай пары. Яго пастаноўка заняла тры месяцы. Цяпер ужо дзеці развучваюць танцы значна хутчэй: апошні, у стылі джайв, зрабілі ўсяго за тыдзень. Некалькі разоў Каця і Вадзім ездзілі на майстар-класы ў школу танцаў «Дар», кіраўніца якой, чэмпіёнка Еўропы і свету па спартыўных танцах на інвалідных калясках Ганна Гарчакова, навучыла падлеткаў асноўным рухам.

— Пакуль у нас займаецца толькі адна пара, — кажа Алена Мікалаеўна, — але зараз пачынаю рыхтаваць малодшых. Каб была змена, калі Каця з Вадзімам скончаць школу. Як заахвочваю дзяцей да танцаў? Ды ім самім гэта падабаецца! Без жадання было б складана.



Каця і Вадзім з Івянца кружацца ў вальсе.

Заваёўваць сваім талентам Польшчу паедуць выхаванцы Чэрвеньскага дома-інтэрната для дзяцей-інвалідаў і маладых інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Калектыў з Чэрвеня, як уладальнік гран-пры сёлетняга рэспубліканскага фестывалю «Мары здзяйсняюцца», атрымаў права паўдзельнічаць у міжнародным форуме «Кракаўскія сустрэчы».

— Нашы дзеці восем гадоў ездзілі на конкурс, займалі другое-трэцяе месцы. А калі ў гэты раз агучылі, што даюць гран-пры, хлопцы і дзяўчаты плакалі ад шчасця, — успамінае **выхавальніца і мастацкі кіраўнік дома-інтэрната Вольга ПРАКАПОВІЧ**. — У Кракаве мы пакажам праграму з чатырох нумароў: песня, пантаміма, танец са стужкамі і тэатр ценяў. Каб дабіцца поспехаў, трэба любіць дзяцей. Калі гэтага няма — ніякая іншая методыка не дапаможа. Мы стараемся адчуць іх настрой, стан здароўя ў гэты момант. Падладжваемся пад сваіх выхаванцаў. Для нас важна выязджаць на конкурсы і фестывалі, каб хлопцы і дзяўчаты не толькі паказвалі сябе, але і кантактавалі з іншымі дзецьмі.

Сёння, калі еўрапейская (а за ёй і беларуская) грамадскасць імкнецца да інклюзіі (уключэння людзей з інваліднасцю ў актыўнае жыццё), больш папулярнымі становяцца праекты, якія даюць магчымасць розным людзям працаваць разам. Адзін з прыкладаў — тэатр лялек, святла і цені «Дом Сонца». Маладыя людзі з асаблівасцямі ў развіцці дапамагаюць супрацоўнікам тэатра выразаць дэкарацыі, майстраваць герояў спектакляў. Хтосьці прыходзіць, каб знайсці паразуменне і падтрымку.

**Галоўнае — ісці ад дзіцяці. Адштурхоўвацца ад таго, што яно ўмее, і паступова павялічваць складанасць заданняў.**

Цікавы сумесны праект нядаўна прадставілі грамадскія арганізацыі SOS-Дзіцячыя вёскі і БелТІЗ. Над пастаноўкай «Вясёлка» моладзь працавала тры месяцы. Ахвотнікаў паўдзельнічаць было так шмат, што давялося нават дапісаць сцэну, каб усім хапіла роляў.

— Трое з акцёраў — цалкам невідушчыя, — расказала нам **кіраўнік аддзела па працы з моладдзю SOS-Дзіцячай вёскі ў Бараўлянах Ірына КУРЫЛЮК**. — Калі раздавалі сцэнарый, думалі, будзем начытваць ім на дыктафон, каб змаглі вывучыць. Аднак не спатрэбілася: у маладых людзей ёсць прынтар, які друкуе тэкст аб'ёмным шрыфтам. Увогуле, у невідушчых людзей шмат прыёмаў, што дапамагаюць ім правільна перамяшчацца на сцэне. У асобных выпадках, напрыклад, акцёры лічылі крокі. Але часцей арыентаваліся на голас: яны добра адчуваюць людзей, якія стаяць побач, ведаюць, адкуль ідзе гук. Гэта карысны вопыт і для падлеткаў з арганізацыі «SOS-Дзіцячыя вёскі». Яны вучыліся бачыць, калі чалавеку патрэбна дапамога.

Ці заўсёды гэтая творчасць перарастае з самадзейнасці ў мастацтва? Не. У многіх выпадках прафесійны рост і не з'яўляецца мэтай. Тое, што моладзь адаптуецца да самастойнага жыцця, вучыцца кантактаваць з равеснікамі і пачынае адчуваць сябе больш упэўнена, ужо дастатковы эфект. З іншага боку, нішто не перашкаджае стаць найлепшым. Дзесьці год таму звыклае меркаванне аб стандартах мадэльнага бізнесу перавярнула дзяўчына з Латвіі Вікторыя Мадэста, якая не пабаялася выйсці на подыум і зняцца ў музычным кліпе без нагі, а пратэз перATварыла ў модны аксесуар. Цудоўны прыклад, калі мастацтва не толькі лечыць, але і натхняе іншых.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
**Фота аўтара.**
*lubneuskaya@zviazda.by*




## КАБ НЕ ТАЯ КУРЫЦА!

...Гадоў колькі таму па тэлебачанні шмат гаварылі пра пажарныя апавяшчальнікі. І так іх расхвальвалі, так раілі набыць — асабліва старым дай адзінокім — што мы з дзедам, хоць яшчэ і не такія, прыслухаліся, прыдбалі два.

Трэба сказаць, што цацкі гэта досыць прыгожанькія — невялічкія такія, беленькія. Мы з імі спачатку па хаце панасіліся, падумалі, дзе ж павесіць. У мяне наконт гэтага былі свае меркаванні, у дзеда, як заўсёды, свае. І яму, на жаль, тады нічога не дакажаш, хоць ты ў лоб страляй...

Карацей, адну гэтую цацку ён прымацаваў у спальні, бліжэй да грубкі, а другую — у кухні, над самай газавай плітой. Мне такая ідэя падалася зусім неразумнай, але ж што ты будзеш рабіць — махнула рукой, падумала: што толку нервы накручваць ды ціск сабе падымаць? Усё роўна ж нічога не зменю! Значыць, хай будзе, як будзе...

І яно, можа, так і было б, калі б праз нейкую гадзіну-другую не пайшла я на кухню абед гатаваць. Наабразала бульбы, уключыла газ... Ад каструль маіх, ад патэльні (выцяжкі ў нас няма), зразумела ж, паднялася пара. І апавяшчальнік той (галоўнае знянацку!) як запішчыць, як зараве! Ледзь не струпянела! Не ведаю, што далей рабіць: ці з хаты ўцякаць, ці есці варыць?..

А калі варыць, то як ? Пад «енк» апавяшчальніка? Дык жа розумам крануцца можна...

Паклікала я гаспадара, спыталася ў яго: «Есці будзеш?..» Кажа: «Само сабой». — «Дык тады, — стаўлю яму ўльтыматум, — знімі са столі гэтую піскліо і закінь, каб вочы мае не бачылі!»

Насупіўся дзед, пакрыўдзіўся, але ж паслухаўся — зняў.

А я потым тры дні сабе локці кусала...

Чаму?

Ледзь не назаўтра ўключыла газ — паставіла яйкі варыць, а сама на двор, на хвіліначку. Закруцілася там. Толькі ў хату вяртацца, ак бачу — курыца ў градах, у гурочках маіх грабецца... «А каб табе, — крычу, — ды «граблі» адсохлі!..»

Зазлавала, думала — заб'ю! А яна, відаць, гэта зразумела: па агародзе носіцца, як той «ераплан»!

Хвілін з 10 я за ёй ганялася, пакуль абедзве зусім не абяссілелі. Курыца тады прысела. Я за крыло яе і ў курынае паселішча. А ў самой не кухня ў галаве, не яйкі: трэба граду ў парадак прывесці — пасадзіць падвялыя агурочкі... Толькі справілася, толькі паліла — чую нейкія выбухі. Мусіць, думаю, суседкі ўнучак мячыкам у вароты цаляе? Выйшла на вуліцу — не, Марадоны няма. А кананада, між тым, не сціхае. І грыміць нібыта ў хаце.

Я туды... Божухна, дым над плітой — каромыслам, каструля чорная... І з яе «феерверк»: яйкі аж пад столь маю «скачуць», у палёце, як снарады, рвуцца... Выключыла газ, парасчыняла вокны-дзверы — паганяла ручнікамі дым. І толькі пасля гэтага ўжо заўважыла, што чыстага месца ў кухні няма: рэшткамі яек заляпана ўсё — столь, сцены, шафкі, занавескі, посуд...

Тры дні мне давялося патрацiць, каб усё адмыць, каб навесці ў кухні ранейшы парадак. А наводзячы, міжволі думаць, што калі б апавяшчальнік пад столлю вісеў, то нічога падобнага ў нас не адбылося б!

Так што вярнулі мы гэтую «цацку» на кухню. Праўда, павесілі не над самай плітой, а трохі збоку. Дзед рады быў, бо атрымалася ж, як быццам, па-ягонаму? Ды і мне смялей. Хаця б таму, што курэй на падворку шмат. Раптам нейкая зноў з панталыку саб'е? Апавяшчальнік загадзя на кухню пакліча.

**Н. Л.**, *Бялыніцкі раён.*

## ДОКТАР АДПАЧЫВАЕ!

Па тэлебачанні, перад тым як паказваць небяспечныя трукі, часцяком папярэджваюць, што гледачам паўтараць іх не варта. Гэты «эксперымент» — я не раю таксама. Але ж расказаць пра яго можна. Значыць...

Пётр і сам разумеў, што п'янка да дабра не давядзе, але ад чаркі адмовіцца не мог: з працы амаль штодня вяртаўся пад мухай. Вядома, сталярны цэх у яго: то дошак некаму нагаблюе, то здзелку зробіць ці карыта для свіней. Людзі ж хочуць разлічацца. А чым, калі не сваёй, мясцовай «валютай»?

У той дзень Пятро выпіў, здаецца, няшмат, аднак да хаты ледзьве прывалокся. Пакуль разуваўся, пакуль распранаўся ды ўкладваўся на тапчан, жонка лямантавала:

— П'янчуга пракляты! Каб табе вантробы вырвала! Каб табе дух заняло! Колькі мне з табой мучыцца?!.

«Песні» гэтыя Пятро ўжо чуў, прычым безліч разоў. Але ж была сярод іх і нейкая новая:

— Лопнула маё цярпенне! Заб'ю гада! — закрычала Ганна. — Сякерай зараз як дам...

— Бі! — агрызнуўся Пётр, высунуўшы галаву з-пад коўдры і ўбачыўшы, што жонка і сапраўды нахіляецца па сякеру... Сам, як на ліха, у парозе паставіў...

Побач з ботамі...

Ганна ўхапіла, здаецца, левы і як гахне ім па коўдры, па тым месцы, дзе муж галаву схаваў...

Галава ад нечаканасці войкнула і адразу ж сціхла.

Ганна, плюнуўшы ў той бок, выскачыла з хаты.

Каб хоць неяк супакоіцца, пайшла ўпраўляцца па гаспадарцы, потым доўга сядзела ля тэлевізара.

І раніцай з мужам размаўляць не стала: бачыла толькі, што той піў гарбату, што пайшоў на працу...

Пад вечар ён вярнуўся дамоў. Што страшэнна здзівіла — цвярозы, як шкельца! Назаўтра і напаслязаўтра — таксама...

— Узяўся чалавек за розум, — сталі хваліць мужыка вяскоўцы. — Гарэлкі, бач, у рот не бярэ! Мусіць, закадзіраваўся? Ганна, куды ты яго звазіла? Колькі грошай аддала?

Тая ў адказ хіба пасміхалася. Але ж да пары: не вытрывала неяк, пахвалілася, што ад гарэлкі адвучыла мужа сама, самым звычайным ботам.

Пётр, праўда, пасля гэтага ляччэння заікам стаў, але і гаспадаром... Як людзі чалавек цяпер жыве, лазню для сям'і паставіў...

А Ганну з той пары празвалі доктаркай. Не без падстаў, згадзіцеся: «закадзіравала» свайго мужыка, прычым — за адно імгненне, задарма і нікуды яго не вывозячы.

**Уладзімір Пугач,**
*м. Навасёлкі, Петрыкаўскі р-н.*

## ПАХАВАННЕ КАТА

Віця, аднакласнік маёй дачкі, разам з бацькамі і старэйшай сястрой жыве ў цэнтры Мінска, у ціхім завулку... Дом у іх стандартны, пяціпавярховы, кватэра — на першым паверсе, што сям'і не дужа падабаецца, затое кату... Вольніца: хоча — у хаце сядзіць, хоча — у акне, а то наогул у фортку сігане і, што называецца, гуляй Кузя! Цэлымі ж днямі можа валэндацца, хоць гэта і досыць небяспечна: побач шумная вуліца, а кот, мякка кажучы, ужо ў гадах...

Карацей, перажывалі за яго сямейнікі, баяліся за жыццё, а ў страха, як вядома, вочы вялікія.

Неяк раз вяртаецца гаспадыня з працы і яшчэ здалёк, на вуліцы каля самага дома, бачыць... збітага машынай ката. Сэрца зайшлося, бо ён такі ж бландзiністы, з такімі ж рыжымі плямкамі на спіне, з акурат такім жа доўгім белым хвастом...

Але паверыць у тое, што гэта Кузі не стала, жанчына не магла. Пабегла дадому, зазірнула ва ўсе пакоі, паклікала ўголас... Ніхто не адгукнуўся. Значыць, памылкі няма?

Па чарзе стала званіць сямейнікам:

— Нашага Кузю машынай забіла!

Муж адпрасіўся з працы, сын — з урокаў у школе, дачка — з лекцый у акадэміі: усе тэрмінова прыехалі дамоў, бо Кузю (у сям'і ён гадоў 15 пражыў!) трэба было як след пахаваць (ну, не пакідаць жа на вуліцы, не выкідваць у сметніцу!).

Гаспадар схадзіў у сутарэнне па рыдлёўку. Дачка прынесла самую прыгожую каробку з-пад боцікаў. На донца яе (для ўлюбёнца нічога не шкада) паслалі новы прыгожы ручнік, на яго асцярожна паклалі памерлага і накрылі — ручніком, кардонкай...

З каробкай і рыдлёўкай выйшлі з дому, моўчкі селі ў машыну і паехалі ў бок Чыжоўскага вадасховішча.

Там, у парку, знайшлі зацішны куточак, выкапалі ямку, апусцілі ў яе «труну» з катом — засыпалі жоўтым пясочкам. Зверху, як і належыць, зрабілі магілку. Дачка на яе паклала кветак. Нейкі час моўчкі пастаялі і нават паплакалі...

Дома гаспадар сказаў:

— Кузьму трэба памянуць.

Гаспадыня, вядома ж, не пярэчыла. На хуткую руку сабралі на стол, селі — кожны на сваё, прывычнае месца...

Не было на ім толькі ката. І ўжо не будзе...

З гэтым трэба змірыцца.

Гаспадар пацягнуўся да пляшкі: з коптурам наліў сабе, на донца — жонцы і дачцэ, кампоту — сыну. На імгненне завагаўся: выпіць трэба седзячы ці ўсё ж такі стоячы? Як раптам (і ў тое ж імгненне)... варухнуліся (а потым адчыніліся!) дзверцы ў шафцы пад мыйкай. І адтуль, сонна выгнуўшы спіну, вылез... Кузя — жывы, здаровы, заспаны!

У сямейнікаў мову адняло!

А Кузьма тым часам падышоў да гаспадыні, цёплым бачком пацёрся аб нагу і, падняўшы вочы, быццам папракнуў: «Ну, што ж гэта вы — як самі, дык вячэраеце, а як ката паклікаць, дык голасу няма».

— Кузечка! Ты жывы! — радасна закрычалі дзеці і кінуліся цiскаць ката.

— Божухна, а каго ж мы пахавалі? — уголас падумала жонка. — Нейкага бяздомніка? Паўдня патрацілі...

Рысу пад размовамі падвёў гаспадар:

— Ну, каго б ні пахавалі, а памянуць варта! І, змахнуўшы слязу, ліха кульнуў сваю чарку.

**Тамара Пятрова**, *г. Мінск.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

## ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ОАО «Минский домостроительный комбинат»,

***опубликованной в газете «Минский курьер» 20.08.2014 г. № 94***

**на строительство объекта:**

**«16-этажный жилой дом по генплану № 12 в микрорайоне № 2 в границах ул. Шаранговича, Горецкого, Рафиева»**

**Для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий** предлагаются 1-комнатная квартира – 1 шт., общей площадью 43,63 м², 2-комнатные квартиры – 2 шт., общей площадью 61,52 м².

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади объекта долевого строительства на день опубликования проектной декларации в текущих ценах с учетом прогнозных индексов в нормативный период строительства без отделочных работ без учета коэффициента этажности **для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий** составляет: 14 645 564 рубля.

Регистрация заявлений для заключения договоров долевого строительства будет производиться по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43 через пять календарных дней после выхода проектной декларации, с «24» июня 2015 г. При себе необходимо иметь паспорт, справку о нуждаемости в улучшении жилищных условий со сверкой данных.

Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43 (отдел инвестиций) тел.: 017 2072060, 044 7771158; Режим работы для приема заявлений и заключения договоров: понедельник – четверг 8.30–16.30, пятница 8.30–15.00.

УНП 100258980

УНП 101015738

## РУП «Белпочта»

## ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРЕГОВОРОВ ПО ВЫБОРУ ПОДРЯДНОЙ ОРГАНИЗАЦИИ

**для выполнения ремонтно-строительных работ на объекте «Промывка и гидравлическое испытание трубопроводов систем отопления на объектах РУП «Белпочта» в г. Минске: в гаражах по пр. Независимости, 10, в отделении почтовой связи №2 по ул. Сторожевская, 8, в отделении почтовой связи №53 по Старовиленскому тракту, 28/1, в отделении почтовой связи №94 по пр. Рокоссовского, 33».**

Процедура переговоров состоится «23» июня 2015 года в 11.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10.
Контакты для получения дополнительной информации: отдел капитального строительства РУП «Белпочта» – тел.: 293-55-29, 293-55-28.

Центр Промышленной Оценки
- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** | | | | |
| Продавец | **Смолевичское районное потребительское общество, Минская обл., г. Смолевичи, ул. Советская, д. 133** | | | | |
| **Предмет аукциона** | | | | | |
| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес | |
| Здание магазина № 27 | Здание специализированное розничной торговли | 134,8 | 614/С-40277 | Минская обл., Смолевичский р-н, Жодинский с/с, д. Напалки, д. 3 | |
| Составные части и принадлежности | Сарай (лит. 1), два крыльца. | | | | |
| **Сведения о земельном участке:** | пл. 0,1320 га предоставлен на праве аренды сроком по 20.06.2039 для обслуживания здания магазина № 27. | | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 153 000 000 белорусских рублей.** | | | | | |
| *Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска, ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».* | | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона. | | | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи. | | | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.** | | | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **20.07.2015 в 11.30 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** | | | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **17.07.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** | | | | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375-17-280-36-37, +375-29-183-69-71, E-mail: auction@cpo.by, www.cpo.by.** | | | | |

Центр Промышленной Оценки
- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** | | | |
| Продавец | **Открытое акционерное общество «Ремстрой»,** Брестская обл., г. Пружаны, ул. Промышленная, 3 | | | |
| Наименование | Назначение | Общая площадь кв.м | Инвентарный номер | Адрес |
| **Лот № 1:** | | | | |
| **Производственные мастерские** | Здание обрабатывающей промышленности иного назначения | 145,7 | 124/С-21320 | Брестская обл., Пружанский р-н, г.п. Шерешево, ул. 17 Сентября, 1 |
| Составные части и принадлежности | Сарай и уборная | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 164 276 340 белорусских рублей.** | | | | |
| **Сведения о земельном участке** | Для обслуживания производственной базы продавцу предоставлен на праве постоянного пользования земельный участок пл. **0,3258 га.** | | | |
| **Лот № 2:** | | | | |
| **Здание радиологической пристройки** | Здание специализированное радиологической пристройки | 1 037,9 | 124/С-13177 | Брестская обл., Пружанский р-н, г. Пружаны, ул. Урбановича, 1 |
| Составные части и принадлежности: | Подвал | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 3 059 700 126 белорусских рублей.** | | | | |
| **Сведения о земельном участке** | Для обслуживания административного здания продавцу предоставлен на праве аренды сроком по 18.12.2029 г. земельный участок пл. **0,0583 га.** | | | |
| **Лот № 3:** | | | | |
| **Административное помещение – 1 этаж** | Административное помещение | 169,6 | 124/D-7641 | Брестская обл., Пружанский р-н, г. Пружаны, ул. Макаренко, 15А-1 |
| **Помещение складов №1, №2** | Складское помещение | 138,4 | 124/D-7639 | Брестская обл., Пружанский р-н, г. Пружаны, ул. Макаренко, 15А/2-1 |
| **Складское помещение №4** | Складское помещение | 143,7 | 124/D-7619 | Брестская обл., Пружанский р-н, г. Пружаны, ул. Макаренко, 15А/2-2 |
| **Здание мастерской** | Здание специализированное мастерской | 401,9 | 124/С-4144 | Брестская обл., Пружанский р-н, г. Пружаны, ул. Макаренко, 15А/1 |
| Составные части и принадлежности: | Навес | | | |
| **Гараж** | Здание специализированное автомобильного транспорта | 236,6 | 124/С-19592 | Брестская обл., Пружанский р-н, г. Пружаны, ул. Макаренко, 15А/3 |
| **В состав лота №3 входят дворовые сооружения:** туалет, асфальтовое покрытие, ворота, забор металлический, плиточное покрытие, и **оборудование:** котел отопительный. | | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 1 537 346 605 белорусских рублей.** | | | | |
| **Сведения о земельном участке** | Для обслуживания зданий продавцу предоставлена доля в праве постоянного пользования (5188/10377) на земельный участок площадью **1,0377** га. | | | |
| **Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона | | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | | |
